Родная газета на роднай мове
# ЗВЯЗДА
Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.
31 ЖНІЎНЯ 2017 г. ЧАЦВЕР №167 (28531)
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



**Мікробы замест хіміі**

СТАР. 3

ЧЫРВОНКА
ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА



**Прыцяжэнне керну**



**Алімпіяда ў… вёсцы**

*ЦЫТАТА ДНЯ*



**Дзмітрый КРУТОЙ, першы намеснік міністра эканомікі:**

*«У цэлым, паводле ацэнкі Мінэканомікі, прагноз сацыяльна-эканамічнага развіцця на 2018 год збалансаваны. Інфляцыя не перавысіць 7%, стаўка рэфінансавання можа знізіцца да 10%. У нас у прынцыпе бездэфіцытны плацежны баланс сфарміраваны без прыцягнення надзвычайнага фінансавання, хоць каля $3 млрд у наступным годзе трэба будзе накіраваць на абслугоўванне знешняга доўгу. Мы захавалі суадносіны прадукцыйнасці працы і росту зарплаты, забяспечылі бяспечны ўзровень інвестыцый да валавога ўнутранага прадукту. Гэта значыць, усе класічныя суадносіны цалкам выкананы».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 31.08.2017 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 1,9335 | ▼ |
| Еўра | 2,3108 | ▼ |
| Рас. руб. | 0,0329 | ▲ |
| Укр. грыўня | 0,0755 | ■ |

ISSN 1990 - 763X

# ПА ДАРОЗЕ НА РЭПЕТЫЦЫЮ



Фота БЕЛТА.

**Удзельніцы народнага фальклорнага калектыву «Таняжанка» з вёскі Тонеж Лельчыцкага раёна нядаўна прымалі ўдзел у міжнародным фестывалі «Самыя старыя песні Еўропы» ў польскім Любліне. Палескія самадзейныя артысты прадставілі там праграму каляндарна-абрадавых песень. Вярнуўшыся з фестывалю, на якім іх выступленне прайшло з аншлагам, таняжанкі працягваюць працаваць над удасканаленнем сваёй праграмы, збіраючыся на рэпетыцыі.**

■ Напярэдадні

## ШТО РОБІЦЬ НАС БЕЛАРУСАМІ?

### Адказы на гэтае пытанне можна знайсці падчас Дня беларускага пісьменства

**Праз некалькі дзён, 2 верасня, наш самы старажытны горад ператворыцца ў бадай галоўную культурна-асветніцкую пляцоўку краіны. Натуральна, што ўжо задоўга да свята на старонках друкаваных і інтэрнэт-выданняў, у эфірах тэлеканалаў пачало з'яўляцца мноства матэрыялаў і пра само свята, і пра самыя яркія яго акцэнты.**

«Шырокая ўвага СМІ — гэта знак таго, што дзяржава дбайна клапоціцца пра развіццё нацыянальнай духоўнасці, культуры, кнігавыдання і ў цэлым пра ўсё тое, што робіць нас беларусамі, умацоўвае наш сённяшні дзень і працуе на далёкую перспектыву, — лічыць **міністр інфармацыі Лілія АНАНІЧ**. — Гэта доказвае і работа нацыянальнага арганізацыйнага камітэта, які зараз узначальвае намеснік прэм'ер-міністра Васіль Жарко і ў які ўваходзяць прадстаўнікі амаль усіх органаў дзяржаўнага кіравання.

СТАР. 2




Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

■ Педсавет

## АД СЛОЎ — ДА ЎЧЫНКАЎ

### Якія бітвы разгортваюцца на сямейнай кухні?

**«Адукацыйныя запыты бацькоў і школьнікаў трэба не толькі задавальняць, але і фарміраваць», — такую думку выказаў падчас гарадскога форуму педагагічных работнікаў «Сталічная адукацыя: базавыя каштоўнасці ў сучасным фармаце» старшыня камітэта па адукацыі Мінгарвыканкама Міхаіл МІРОНЧЫК.**

### «За дзяржаву крыўдна...»

Цяпер у сталіцы функцыянуе 241 установа агульнай сярэдняй адукацыі. Разнастайныя па тыпах і відах, яны здольныя даць школьнікам адукацыю рознага ўзроўню ў адпаведнасці з іх патрэбамі.

— Прычым запыты на павышаны ўзровень адукацыі ў горадзе ўзрастаюць. І мы рэагуем на гэты выклік, — падкрэсліў старшыня камітэта. — Пятую частку ад усіх устаноў агульнай сярэдняй адукацыі ў Мінску складаюць гімназіі і ліцэі. Геаграфічна яны даступныя для жыхароў усіх раёнаў горада. Павышаны ўзровень вывучэння прадметаў забяспечваюць таксама сетка профільных класаў і факультатывы. За два гады ў кожным сталічным раёне сфарміраваліся свае мадэлі профільнага навучання. У горадзе дасягнуты аптымальныя суадносіны базавых і профільных класаў. У 2015/2016 навучальным годзе ў працэнтным выражэнні яны складалі 49 да 51. У мінулым — 47 да 53. У новым навучальным годзе суадносіны будуць прыкладна такія ж.

Кіраўнік сталічнай сістэмы адукацыі з задавальненнем адзначыў значнае павелічэнне ў горадзе колькасці ўстаноў, якія адкрываюць класы і групы прафесійнай накіраванасці, асабліва педагагічныя. Дарэчы, эфектыўнасць гэтай працы пацвярджаецца тым, што 72% выпускнікоў, якія атрымалі рэкамендацыі для паступлення на педагагічныя спецыяльнасці, працягнуць сваё навучанне па абраным профілі, але ўжо ў ВНУ.

СТАР. 4

■ Парламенцкі дзённік

# ВІДАВОЧНЫЯ ПЕРСПЕКТЫВЫ

## Віцэ-спікер польскага сейма хоча пашырыць супрацоўніцтва з парламентам Беларусі

**Такое меркаванне Рышард Цярлецкі выказаў па выніках перамоў з намеснікам старшыні Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі Баляславам ПІРШТУКОМ.**

— Мы правялі вельмі цікавую і пазітыўную сустрэчу. Безумоўна, польскія палітыкі зараз удзяляюць асаблівую ўвагу парламенцкаму супрацоўніцтву на міжнародным узроўні, у тым ліку — з Беларуссю, — адзначыў Рышард Цярлецкі. — Мы абмеркавалі як эканамічныя праблемы і эканамічнае супрацоўніцтва, так і міжнародную палітыку і тыя пытанні, якія хвалююць нашу дзяржаву. І мы плануем у далейшым зрабіць усё, каб узаемадзеянне паміж нашымі парламентамі і дзяржавамі было яшчэ больш шырокім.

Баляслаў Пірштук пацвердзіў, што спектр пытанняў, якія абмяркоўвалі бакі, быў надзвычай разнастайны. Падрабязна агавораны канструктыўныя адносіны, а таксама супрацоўніцтва на міжнародных пляцоўках, у рамках якіх узаемадзейнічаюць Беларусь і Польшча. Віцэ-спікер адзначыў, што за апошнія гады міжпарламенцкія адносіны значна актывізаваліся. «Мы абмеркавалі пытанні прыгранічнага супрацоўніцтва, закранулі эканамічны блок і адзначылі, што ў нас дастаткова стабільна на працягу апошніх гадоў трымаецца тавразварот. Ёсць яго рост, нягледзячы на складаныя эканамічныя ўмовы», — дадаў Баляслаў Пірштук.

***

Падчас сустрэчы з польскай дэлегацыяй **намеснік старшыні Савета Рэспублікі Мар'яна ШЧОТКІНА** адзначыла, што гэты візіт мае вельмі вялікае значэнне, паколькі апошнія два гады Беларусь выбудоўвае актыўныя адносіны з Польшчай. «Не заўсёды яны атрымліваюцца роўнымі. Нам трэба як мага больш весці дыялог, дыскутаваць, шукаць нашы агульныя інтарэсы і працаваць разам, — сказала Мар'яна Шчоткіна. — Мы самыя блізкія суседзі, у нас вельмі вялікая гісторыя, у нас шмат сяброў і сваякоў пражывае на тэрыторыі Польшчы і Беларусі. Мы гістарычна былі разам — і мы будзем разам заўсёды, гэта аб'ектыўная рэальнасць». На думку намесніка старшыні Савета Рэспублікі, ад міжпарламенцкіх адносін дзвюх краін залежыць многае, таму дзяржавы павінны працаваць з максімальнымі намаганнямі.

**Уладзіслаў ЛУКАШЭВІЧ.**
*lukashevich@zviazda.by*

■

# ШТО РОБІЦЬ НАС БЕЛАРУСАМІ?

***(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)***

Наведваючы ў складзе аргкамітэта Полацк, я злавіла сябе на думцы, што варта часцей бываць у старажытных гарадах краіны, з багатай гісторыяй і развітой духоўнасцю, каб ведаць, адкуль нашы карані».

Палачане ўмеюць здзіўляць, таму не ўсе сюрпрызы праграмы раскрытыя і не ўсе лічбы і вынікі вядомыя. Мы яшчэ даведаемся, хто стане лаўрэатам Нацыянальнай літаратурнай прэміі, а таксама ўпершыню зможам пабачыць тэатралізаваную праграму «Беларускі шлях», якая распавядзе пра нашу дарогу да незалежнасці. Яе аўтары зрабілі акцэнт на тым, што беларуская дзяржава грунтуецца не на заваёвах і войнах, але на стваральнай працы выдатных асветнікаў.

«У гэтай маштабнай дзеі будзе паказаны наш шлях да сучаснасці — ад першых княстваў на поўначы краіны, ад Рагвалода і Рагнеды; праз дзейнасць выдатных асветнікаў Ефрасінні Полацкай, Францыска Скарыны, Сімяона Полацкага, пісьменнікаў — пачынальнікаў нацыянальнай літаратуры. Адным з лейтматываў пастаноўкі стануць нацыянальныя сімвалы, у іх ліку — крыж Ефрасінні Полацкай», — расказала **першы намеснік міністра культуры Ірына ДРЫГА**.

Дзень пісьменства — гэта, безумоўна, і свята кнігі. У Полацк рыхтуецца выправіцца дэлегацыя са 120 пісьменнікаў, якія перададуць 100 кніг сучасных аўтараў у бібліятэкі горада, а літаратурная праграма ўключае як чытанні, так і музычныя выступленні, канцэрты. Дарэчы, мы даведаемся і імёны пераможцаў конкурсу «Жывая класіка», у якім прынялі ўдзел некалькі тысяч школьнікаў з усіх рэгіёнаў краіны.



Фота БЕЛТА.

**Падрыхтоўка да Дня беларускага пісьменства ў Полацку вялася на самым сур'ёзным узроўні.**

500-годдзе беларускага кнігадрукавання — адзін з яркіх акцэнтаў свята. Гэты выдатны юбілей ужо адзначаны цэлым шэрагам сацыяльна значных праектаў. Адзін з якіх — «Сусветная спадчына Францыска Скарыны» — узнагараваны Гран-пры Міжнароднага конкурсу «Мастацтва кнігі» краін — удзельніц СНД. Такая высокая ацэнка яшчэ раз пацвярджае, што спадчына Скарыны, яго традыцыі — гэта гонар не толькі нацыянальнага, але і сусветнага кнігавыдання.

Сталіцай наступнага Дня беларускага пісьменства стане Іванава, што на Брэстчыне. Вялікая дэлегацыя кіраўніцтва горада і вобласці рыхтуецца прыехаць у Полацк, каб пераняць ганаровую эстафету і павучыцца, як варта прымаць гасцей.

Шмат яшчэ можна распавядаць пра сёлетняе свята пісьменства. Ды што казаць — лепш выправіцца на выхадныя ў Полацк, каб далучыцца да гэтага грандыёзнага дзейства.

**Марына ВЕСЯЛУХА.**
*vesialuha@zviazda.by*

# ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

## У затопленым Х'юстане з-за марадзёрства ўвялі каменданцкую гадзіну



У выніку праліўных дажджоў, якія прынёс ураган «Харві», значная частка горада аказалася пад вадой. Па меншай меры 15 чалавек загінулі, многія дамы разбураныя.

Па словах мэра Х'юстана Сільвестра Тэрнера, каменданцкая гадзіна неабходна для барацьбы з марадзёрствам. Яна ўведзена з паўночы да 5 гадзін раніцы па мясцовым часе — на нявызначаны тэрмін. Пад яе дзеянне не падпадаюць валанцёры, супрацоўнікі экстранных службаў і людзі, якім у гэты час трэба дабірацца на работу або з яе. Х'юстан — чацвёрты па памерах горад ЗША.

Прэзідэнт Дональд Трамп прыехаў у Тэхас, каб асабіста ацаніць маштабы разбурэнняў. «Гэты ўраган, ён эпічны. Але ведаеце, гэта адбылося ў Тэхасе, а Тэхас з усім можа справіцца», — сказаў прэзідэнт. Раней узровень вады ў мясцовым вадасховішчы падняўся да крытычнага, і вада пачала пераліваццца праз дамбу. Па словах мэра Тэрнера, каменданцкая гадзіна ўведзена для таго, каб прадухіліць крадзяжы ў дамах. Раней гарадскія ўлады паведамлялі пра выпадкі марадзёрства і ўзброеныя рабаванні, у тым ліку і людзьмі, што выдаюць сябе за паліцэйскіх. Свае дамы ў горадзе пакінулі тысячы жыхароў.

## У ААН рашуча асудзілі ракетныя выпрабаванні Паўночнай Карэі

Савет Бяспекі ААН рашуча асудзіў ракетныя выпрабаванні КНДР і заклікаў да спынення ядзернай праграмы, паведамляюць інфармагенцтвы.

У прынятай Саветам Бяспекі ААН па выніках закрытых кансультацый заяве гаворыцца, што дзейнасць КНДР уяўляе сабой пагрозу не толькі для рэгіёна, але і для ўсіх дзяржаў — членаў ААН. У выніковым дакуменце падкрэсліваецца, што СБ ААН рашуча асуджае праведзенае КНДР выпрабаванне, а таксама серыю пускаў балістычных ракет. У заяве ўтрымліваецца патрабаванне да КНДР спыніць пускі ракет і выконваць прынятыя раней рэзалюцыі Савета Бяспекі ААН. Таксама адзначаецца, што краіна павінна адмовіцца ад усіх ядзерных узбраенняў і існуючых ядзерных праграм цалкам і незваротна. Акрамя таго, КНДР не павінна праводзіць у далейшым ядзерныя выпрабаванні і ажыццяўляць якія-небудзь правакацыі, а таксама адмовіцца ад усёй зброі масавага знішчэння.

Нагадаем, што 29 жніўня КНДР запусціла ракету ў бок рэгіёна Тахоку ў Японіі. Ракета праляцела над паўночнымі рэгіёнамі Японіі, развалілася на тры часткі і ўпала ў Ціхім акіяне каля берагоў вострава Хакайда.

## Ірландскія вучоныя выявілі сувязь паміж мікрафлорай кішэчніка і мазгавой дзейнасцю

Неспакой, страх і дэпрэсія з'яўляюцца следствам дысфункцыі кішачнай мікрафлоры. Да такой высновы прыйшлі вучоныя з універсітэцкага каледжа горада Корк.

Ірландскія мікрабіёлагі даследавалі тое, як мікрачасціцы рыбануклеінавай кіслаты пад уздзеяннем кішачных бактэрый уплываюць на мозг. «Паміж кішачнай флорай і мозгам адбываецца актыўная камунікацыя», — сцвярджаюць вучоныя Джэрард Кларк і Джон Крыян на старонках спецыялізаванага часопіса «Мікрабіём». У ходзе доследаў мышы з моцна спустошанай мікрафлорай кішэчніка дэманстравалі моцны неспакой, асацыяльна-дэпрэсіўныя паводзіны і зніжэнне кагнітыўных функцый. Зацяжное ж парушэнне здароўя кішачнага тракта значна павялічвае рызыку нейрадэгенератыўных захворванняў. Такім чынам, як мяркуюць даследчыкі, з дапамогай спецыяльных харчовых дабавак-прабіётыкаў цалкам рэальна лячыць многія псіхічныя адхіленні.

Уздзеянне на кішачныя бактэрыі адкрывае шырокія гарызонты ў медыцыне. «Мы на парозе псіхабіятычнай рэвалюцыі», — заяўляюць ірландскія мікрабіёлагі.

■ Дыялог бізнесаў

# МАШЫНЫ Ў ДАПАМОГУ ДЫВЕРСІФІКАЦЫІ

**Новыя дзелавыя сустрэчы — новыя магчымасці. Беларускія машынабудаўнікі зноў задумваюцца аб пашырэнні геаграфіі сваіх паставак. У гарачым Судане патрабуюцца нашы БелАЗы. Яно і нядзіўна, бо, зазначыў пасол Беларусі ў Егіпце і Судане па сумяшчальніцтве Сяргей РАЧКОЎ, гарнарудная прамысловасць з'яўляецца драйверам росту эканомікі ў гэтым рэгіёне. Не менш цікавыя айчынныя машыны і Егіпту. Пра нас не забываюць і традыцыйныя расійскія партнёры — у Чувашыі МТЗ плануе арганізаваць новы сэрвісны цэнтр.**

**Намеснік маркетынг-дырэктара па камерцыйнай рабоце на рынках краін СНД МТЗ Аляксандр КАЗАКЕВІЧ** расказаў, што на сустрэчы з расійскімі партнёрамі абмяркоўваліся планы па арганізацыі яшчэ аднаго сэрвіснага цэнтра МТЗ і павелічэнні аб'ёму паставак. «Пастаўкі трактароў у Чувашыю значна павялічыліся. З пачатку года паставілі каля 60 трактароў, сёлета яшчэ плануецца адгрузіць каля 100 адзінак. МТЗ займае вядучае месца сярод пастаўшчыкоў трактарнай тэхнікі ў Чувашыі», — расказаў Аляксандр Казакевіч. Цяпер МТЗ вядзе актыўную дзейнасць на рынках больш чым 60 дзяржаў. Завод распрацоўвае, вырабляе і экспартуе колавыя трактары і запчасткі да іх, арганізуе на ліцэнзійнай аснове іх вытворчасць за мяжой, аказвае паслугі па наладжванні і правядзенні сэрвісу пастаўленых машын, праводзіць навучанне па эксплуатацыі і тэхабслугоўванні выпускаемай тэхнікі.

Акрамя таго, прадстаўнікі нашай краіны прапрацоўваюць магчымасць стварэння ў Судане зборачнай вытворчасці трактароў BELARUS. Сяргей Рачкоў выказаў надзею, што згаданы праект у хуткім часе рэалізуецца. «Пастаўкі трактароў у гэтую краіну павялічваюцца, але мы шукаем варыянты больш значнага росту экспарту. Патрэбы Судана ў трактарах істотныя», — сказаў Сяргей Рачкоў. На яго думку, Судан можа быць выкарыстаны ў якасці пляцоўкі для выхаду беларускіх тавараў у сумежныя краіны і ў цэлым на Афрыканскі кантынент.

БелАЗ адновіць пастаўкі самазвалаў у Егіпет. Сяргей Рачкоў адзначыў, што ўжо ёсць кантракт па пастаўцы ў Егіпет пяці самазвалаў БелАЗ. «Спадзяёмся, што сёлета яны будуць выкананы. Апошні раз гэтая тэхніка пастаўлялася ў 2008 годзе. У Егіпце наладжаны прамыя кантакты з кампаніямі, якія зацікаўлены ў нашай тэхніцы, у тым ліку з цэментнымі вытворчасцямі», — растлумачыў пасол. Што датычыцца экспарту беларускіх самазвалаў у Судан, пасол адзначыў, што ўжо ўдалося знайсці партнёра і прыступіць да канкрэтнай прапрацоўкі пытання іх паставак.

**Ілья КРЫЖЭВІЧ.** *kryzhevich@zviazda.by*

■

■ Супрацоўніцтва

# Разам на варце закону

**Злачыннасць усё часцей сцірае межы паміж краінамі. Асабліва гэта датычыцца сферы высокіх тэхналогій, наркатрафіка, гандлю людзьмі... І менавіта таму важна, каб праваахоўнікі з розных дзяржаў супрацоўнічалі адзін з адным.**

Гэтай тэме і была прысвечана сустрэча старшыні Следчага камітэта Беларусі Івана Наскевіча з прадстаўніком Федэральнага бюро расследаванняў Злучаных Штатаў Амерыкі па прававых пытаннях Ёханэсам Ван Дэн Хугенам, часовым паверанным у справах ЗША ў Рэспубліцы Беларусь Робертам Райлі, а таксама з супрацоўнікамі амерыканскага пасольства ў нашай краіне.

«Мы з вамі — прадстаўнікі праваахоўных органаў. І таму разумеем, што цяпер злачыннасць усё часцей выходзіць за дзяржаўныя межы, нясе рэальную пагрозу міжнароднай бяспецы і патрабуе прыняцця адэкватных і ўзгодненых мер», — сказаў Іван Наскевіч.

У сваю чаргу, Ёханэс Ван Дэн Хуген запэўніў беларускіх калег у садзейнічанні пры іх запыце аб аказанні прававой дапамогі па крымінальных справах.

**Валяр'ян ШКЛЕННІК,** *schklennik@zviazda.by*

**НЕСПРЫЯЛЬНЫЯ ДНІ І ГАДЗІНЫ Ў ВЕРАСНІ**

**2, субота, 18.30 — 22.00**
**6, серада, 22.00 — 24.00**
**7, чацвер, 0.00 — 14.00**
**9, субота, 17.30 — 19.00**
**11, панядзелак, 3.00 — 21.30**
**13, серада, 20.30 — 24.00**
**15, пятніца, 23.00 — 24.00**
**16, субота, 0.00 — 3.30**
**18, панядзелак, 3.00 — 7.00**
**20, серада, 7.30 — 12.00**
**22, пятніца, 15.00 — 19.30**
**24, нядзеля, 9.30 — 24.00**
**25, панядзелак, 0.00 — 6.00**
**27, серада, 13.00 — 18.30**
**30, субота, 0.00 — 8.30**

# Мікробныя ўгнаенні і лячэнне клеткамі

## За пяць гадоў у краіне выраблена біятэхналогій на 3 мільярды долараў

**«Гэта сур'ёзная сума. Нават у Мінэканомікі здзіўляюцца: як так? У нас ёсць усё для развіцця біятэхналогій: рэсурсы, людзі, якія могуць гэта рабіць», — дзеліцца генеральны дырэктар дзяржаўнага навукова-вытворчага аб'яднання «Хімічны сінтэз і біятэхналогіі», дырэктар Інстытута мікрабіялогіі Эмілія КАЛАМІЕЦ.**

За пяць гадоў па дзяржаўных праграмах у краіне створана больш за 170 сучасных біятэхналогій, мадэрнізавана 12 вытворчасцяў, арганізавана восем цэнтраў і лабараторый, дзевяць новых прадпрыемстваў і 39 біятэхналагічных вытворчасцяў.

Пераважнае развіццё атрымалі распрацоўкі ў сферы сельскай гаспадаркі і прамысловасці. Напрыклад, розныя віды біяпаліва: біядызель, біягаз.

— Мы прапануем на рынак розныя прэпараты, якія дазваляюць замяніць хімічныя, мінеральныя ўгнаенні. Наша навінка — комплексныя мікробныя прэпараты. Пры ўнясенні іх у глебу абагачаюцца цэнозы, і гэта дазваляе атрымаць экалагічна чыстую прадукцыю і павысіць ураджайнасць, — адзначыла Эмілія Каламіец. — На мікробныя прэпараты за мяжой попыт большы, чым у краіне. Актыўна імі цікавяцца ў Расіі, краінах Балтыі. Чаму ў Беларусі не? Для нас гэта таксама незразумела. Мы пастаянна расказваем аб перавагах такіх угнаенняў, але, напэўна, прасцей «хімію» засыпаць і забыць.

Сярод беларусаў расце попыт на генетычныя аналізы — іх праведзена ўжо больш за 100 тысяч. Запатрабавана генетычнае тэсціраванне спартсменаў: яго прайшло каля 500 элітных атлетаў з 30 нацыянальных зборных камандаў. Такое тэсціраванне дазваляе вызначыць здольнасці чалавека, даведацца, калі ён выходзіць на пік сваёй формы і калі настае спад. Гэта дапамагае выпрацаваць індывідуальны падыход да кожнага.

А з наступнага года пры прыёме на работу, магчыма, будуць праводзіць генетычнае тэсціраванне на... стрэсаўстойлівасць.

— У лістападзе мы прадставім гэтую методыку на адабрэнне. Калі яна будзе ўхвалена, то пачнём праводзіць тэсціраванне са студзеня 2018 года, — тлумачыць дэталі **дырэктар Інстытута генетыкі і цыталогіі Валянціна ЛЕМЕШ**. — Яно будзе карысна пры прыёме, напрыклад, у МНС. Бо чалавек можа выдатна падыходзіць для работы па фізічных параметрах, але пры выглядзе абгарэлага чалавека ўпадаць у паніку.

Беларускія навукоўцы развіваюць таксама клетачныя тэхналогіі. Іх прымяняюць для лячэння захворванняў, якія з цяжкасцю паддаюцца іншым метадам.

— Клетачныя тэхналогіі ў свеце набываюць папулярнасць. Калі першыя такія метады лячэння ў ЗША з'явіліся ў канцы мінулага стагоддзя, то цяпер кожны дзясяты амерыканскі хірург выкарыстоўвае іх у сваёй практыцы, — расказвае **намеснік дырэктара па навуковай і інавацыйнай рабоце Інстытута біяфізікі і клетачнай інжынерыі Наталля ПШЫБЫТКА**. — У нашай краіне актыўна распрацоўваюцца метады, якія будуць прымяняцца ва ўралогіі, стаматалогіі, афтальмалогіі. Сёння мы з дапамогай клетачных тэхналогій лечым трафічныя язвы. Гэта, магчыма, не вельмі распаўсюджанае захворванне, але яно прычыняе вялікую шкоду пацыентам і істотна пагаршае якасць іх жыцця. Гэтым метадам у Беларусі пралечана ўжо некалькі дзясяткаў людзей. Ва ўсіх выпадках назіраўся станоўчы эфект.

Нашы навукоўцы могуць пахваліцца і першымі распрацоўкамі па аднаўленні нервовых клетак. Акрамя гэтага, яны будуць удзельнічаць у стварэнні фотадатчыка для дэтэкцыі раку, у прыватнасці раку малочнай залозы. Праект рэалізуецца сумесна з навукоўцамі Латвіі, Літвы, Францыі, Іспаніі. Датчык будзе пераўтвараць сігнал біямалекул у аптычны сігнал і хутка і якасна тэсціраваць наяўнасць анкалагічнага захворвання ў арганізме.

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.** *lubneuskaya@zviazda.by*


Центр Промышленной Оценки

• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

| Извещение о проведении повторного аукциона | | | | |
|---|---|---|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703 | | | |
| **Продавец** | ПК «Ольговское», Витебская обл., Витебский р-н, аг. Ольгово, ул. Центральная, 50 | | | |
| **Предмет аукциона** | | | | |
| **Наименование** | **Назначение** | **Общая площадь** | **Инвентарный номер** | **Адрес** |
| **Магазин** | Торговое помещение | 155,5 кв. м | 200/D-108857 | Витебская обл., г. Витебск, ул. Чкалова, д. 30Б, пом. 1 |
| **Сведения о земельном участке** | Общ. пл. 0,0234 га, целевое назначение: земельный участок для содержания и обслуживания здания под продовольственный магазин на территории рынка «Южный». Доля продавца в праве аренды на земельный участок: 22/25. Срок действия договора аренды: до 11.11.2018 | | | |
| **Начальная цена с НДС 20%** | **124 920,00 белорусских рублей (снижена на 20%)** | | | |
| **Задаток 10%** от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях (BYN) перечисляется на р/с № BY60BLBB30120191021390001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области, г. Минск, ул. Коллекторная, 11 БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа — ЗАО «Центр промышленной оценки» | | | | |
| **Срок подписания договора купли-продажи** | **10** рабочих дней после проведения аукциона | | | |
| **Условия оплаты предмета аукциона** | | | | |
| Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5%) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после заключения договора купли-продажи | | | | |
| Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.cpo.by | | | | |
| Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия | | | | |
| Предыдущее извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» 14.07.2017 г. | | | | |
| **Дата и время проведения аукциона** | **18.09.2017** в 14.00 по адресу: **г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»** | | | |
| **Дата и время окончания приема документов** | **14.09.2017** до 17.00 по адресу: **г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»** | | | |
| **Контактные телефоны** | **+375 17-280-36-37; +375 29-317-95-42. Email: auction@cpo.by** | | | |


■ Дзень горада

# Гіганцкі торт, шоу фантанаў і «палаючыя» паветраныя шары

## Як сталіца будзе адзначаць юбілей

**Асноўныя мерапрыемствы, прысвечаныя 950-годдзю Мінска, пройдуць на наступным тыдні з 7 па 10 верасня. У гараджан і гасцей сталіцы на выбар будзе больш за 80 варыянтаў, як правесці святочныя дні.**

Як расказаў **начальнік галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Мінгарвыканкама Павел СКАЛАБАН**, стартуюць урачыстасці ў чацвер навуковай канферэнцыяй «Мінск і мінчане: дзесяць стагоддзяў гісторыі», у якой прымуць удзел больш за 100 чалавек, у тым ліку і з іншых краін. Напярэдадні асноўных мерапрыемстваў у Палацы культуры прафсаюзаў пройдзе ўзнагароджванне пераможцаў конкурсу «Найлепшы па прафесіі», на наступны дзень у Тэатры оперы і балета адбудзецца цырымонія, прысвечаная «Мінчанам года». Ужо ў пятніцу гараджане змогуць акунуцца ў атмасферу свята ў музейна-паркавым комплексе «Перамога», дзе ўвечары будзе арганізавана «Шоу пявучых фантанаў» у суправаджэнні Дзяржаўнага акадэмічнага сімфанічнага аркестра і майстроў мастацтваў.

Галоўным днём народных гулянняў стане субота. Адкрые святкаванне ўскладанне кветак да абеліска «Мінск — горад-герой». Традыцыйна асноўная пляцоўка размесціцца каля Палаца спорту і ў Верхнім горадзе. Непасрэдна каля Палаца спорту разгорнецца турнір па сілавым экстрыме, у якім прымуць удзел волаты з пяці краін. Прайшоўшы ўсяго некалькі соцень метраў, можна будзе апынуцца на міжнародным фестывалі гістарычнай рэканструкцыі «Мінск старажытны». Тых жа, каго больш цікавяць сучасныя тэхналогіі бітваў, запрашаюць у нядзелю на Дзень танкіста ў Парк Перамогі.

— Свой удзел у святах ужо пацвердзілі 17 замежных дэлегацый з 11 краін. У Мінск прыбудзе мэр горада Нотынгема (Вялікабрытанія), які з'яўляецца пабрацімам Мінска, каб наладзіць эканамічныя сувязі. Асаблівая ўвага будзе ўдзелена аўтатранспартнай сферы, — паведаміў **старшыня камітэта экаханомікі Мінгарвыканкама Мікалай РАГАШЧУК**.

Па словах **намесніка начальніка ўпраўлення спорту і турызму Мінгарвыканкама Святланы ДЗЯМЕШКІ**, у сталіцы пройдуць прымеркаваныя да Дня горада спаборніцтвы па валейболе, веславанні на байдарках і каноэ, парусным спорце, чэмпіянат горада па гіравым спорце.

Найбольш відовішчнай падзеяй стане Мінскі паўмарафон, запланаваны на нядзелю. Па папярэдніх даных удзел у ім возьмуць 20 тысяч чалавек. Забег на 5 і 10 кіламетраў пачнецца а 10-й раніцы, на 21 кіламетр — у 12.30. Бегавая траса пройдзе па цэнтры горада, таму многія вуліцы будуць перакрытыя. Прадстаўнікі Мінгарвыканкама рэкамендуюць адмовіцца ў святочныя дні ад паездак на асабістым транспарце, а скарыстацца грамадскім, які будзе працаваць ва ўзмоцненым рэжыме. У нядзелю асаблівая нагрузка ляжа на метро, таму час чакання цягніка будзе паменшаны, падрыхтаваны два дадатковыя саставы.

Акрамя відовішчаў у лішку будуць і пачастункі: працягласць гандлёвых радоў, устаноўленых спецыяльна да свята па ўсім горадзе, складзе больш за два кіламетры. «Асаблівы акцэнт будзе зроблены на стравы, якія прыгатуюць на вачах гасцей. Дарэчы, якая ўрачыстасць без торта? Ён у Мінска будзе, і вельмі вялікіх памераў: 250-кілаграмовая кветка, якая складаецца з дзевяці пялёсткаў, што сімвалізуюць раёны сталіцы. На іх будуць намаляваныя знакавыя гарадскія аб'екты. Пакаштаваць торт на смак зможа любы ахвотны», — запэўніў **намеснік начальніка аддзела арганізацыі гандлю і грамадскага харчавання галоўнага ўпраўлення спажывецкага рынку Мінгарвыканкама Аляксандр ФРАЛОЎ**.

Калі да торта дабрацца ўсё ж такі не атрымаецца, на выбар будуць прапанаваныя іншыя прадукты ці прадметы, упрыгожаныя святочнай сімволікай. Зрабіць гэта можна выгадна, паколькі ва ўсіх універмагах Мінска пройдуць святочныя акцыі са зніжкамі аж да 50 працэнтаў.

**Дар'я КАСКО.** *kasko@zviazda.by* ■

ФАКТЫ ПАДЗЕІ НАВІНЫ

### ПОШТА — ДЗЕЦЯМ

**Пакеты з канцылярскімі прыладамі, сшыткі і дзіцячыя часопісы ўручыла сваім шматдзетным супрацоўнікам кіраўніцтва Магілёўскага філіяла Белпошты.**



Віншаванні прымалі паштальёны Наталля Аўдзеева, маці чацвярых дзяцей, і Тамара Царонак, у сям'і якой выхоўваецца трое дзетак.

— Такім чынам мы далучыліся да дабрачыннай акцыі «Прафсаюзы — дзецям», — адзначыла **дырэктар Магілёўскага філіяла РУП «Белпошта» Алена КОТАВА**. — За кошт прафсаюзных сродкаў на нашым прадпрыемстве аказваецца матэрыяльная дапамога шматдзетным, малазабяспечаным і апякунскім сем'ям, а таксама сем'ям, дзеці якіх ідуць у першы клас.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.** *zigulya@zviazda.by*

### ЖОНКА СУПРАЦЬ РУЛЕТКІ І... УСЁ

**Калі наш чалавек з прычыны азартных гульняў ставіць сябе ці сваю сям'ю ў цяжкае матэрыяльнае становішча, то па рашэнні суда яму могуць абмежаваць наведванне гульнявых устаноў і ўдзел у азартных гульнях — на тэрмін ад шасці месяцаў да трох гадоў. А цяпер (з 28 жніўня) звярнуцца ў суд з заявай аб такім абмежаванні змогуць і сваякі гульнямана, нагадвае Міністэрства па падатках і зборах.**

Да гэтага часу падобную паперу мог напісаць непасрэдна сам гулец. Цяпер падаць заяву маюць права бацькі, дзеці, усынавіцелі (удачаральнікі), усыноўленыя (удачароныя), а таксама родныя браты і сёстры, дзед, бабка, унукі, апекуны, папячыцелі, муж (жонка), а таксама іншыя асобы, якія пражываюць сумесна з гульцом і вядуць агульную гаспадарку, а яшчэ пракурор і органы апекі і папячыцельства.

Нагадаем, што гэтая норма прадугледжана Указам №319 у сувязі з тым, што члены сям'і і сваякі гульнямана часта звярталіся са скаргамі: буйныя пройгрышы негатыўна ўплываюць на іх фінансавы, сацыяльны і душэўны стан.

**Сяргей КУРКАЧ.** *kurkach@zviazda.by*

### НАВОШТА НЯБОЖЧЫКУ... ДОЛАРЫ?

**У Музеі гісторыі прыватнага калекцыянавання працуе выстава «Долары краін свету канца XIX — XXI стагоддзя».**

Аказваецца, ёсць спецыяльныя долары, якія ў Кітаі «дораць» нябожчыкам. Калі такі сувенір падарыць жывому, крыўда будзе на ўсё жыццё. А ў ЗША праз два гады пасля смерці прэзідэнта традыцыйна выпраўляюць памятныя манеты з выявай яго профілю. І тое, што існуе купюра вартасцю 1 мільён долараў, зусім не байка. Такія ёсць у калекцыі членаў клуба мільянераў. Дарэчы, як і 100-тысячная банкнота. Спецыяльныя долары выраблююць нават для тых, хто хоча падтрымаць даследаванні ў Антарктыдзе...



Грошы для нябожчыкаў, якія вырабляюць у Кітаі.

Віцебскі калекцыянер Леанід Ялаў пачаў калекцыянаваць долары яшчэ ў савецкія гады. Тады, нагадаю, іх нельга было легальна вывезці за мяжу, прывезці, прадаць. Знаёмы прывёз з замежнай камандзіроўкі. 1-доларавая банкнота стала пачаткам калекцыі. На выставе можна ўбачыць больш за 250 экспанатаў. Прадстаўлены долары ЗША, Канады, краін Паўднёвай Амерыкі, Азіі, Аўстраліі і Акіяніі. Усюды ў гэтай валюты свой індывідуальны і арыгінальны дызайн. У наш час долар выкарыстоўваюць у 26 краінах.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.** *pukshanski@zviazda.by*

### КАНФІСКАВАЛІ 1,8 ТЫСЯЧЫ БУТЭЛЕК АЛКАГОЛЮ

**Супрацоўнікі АБЭЗ Кастрычніцкага РУУС сталіцы за незаконную прадпрымальніцкую дзейнасць у Талачынскім раёне затрымалі 43-гадовага грамадзяніна Расіі.**

Мужчына рэалізоўваў гарэлку нібыта расійскай вытворчасці, паведамілі ў ГУУС Мінгарвыканкама. Насамрэч такіх гандлёвых марак, якія меліся ў яго «асартыменце», не існуе. Аператыўнікі канфіскавалі 1816 бутэлек кантрафактнай алкагольнай прадукцыі. Кошт адной бутэлькі спіртнога пры набыцці ў розніцу — пяць рублёў. За незаконную прадпрымальніцкую дзейнасць у адносінах да мужчыны складзены адміністрацыйны пратакол, што цягне за сабой пакаранне ў выглядзе штрафу да ста базавых велічынь з канфіскацыяй алкаголю. Раней мужчына прыцягваўся ў Беларусі да адказнасці за аналагічнае правапарушэнне. Тады ў яго канфіскавалі каля 500 літраў кантрафактнага спірту.

**Сяргей РАСОЛЬКА.** *rs@zviazda.by*

# АД СЛОЎ — ДА ЎЧЫНКАЎ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

На больш ранніх ступенях навучання індывідуальная патрэбы і здольнасці дзяцей рэалізуюцца праз сістэму факультатываў. У мінулым навучальным годзе на іх было выдзелена 28 667 гадзін. Самыя запатрабаваныя — гуманітарны, прыродазнаўча-матэматычны, спартыўны, агульнаразвіццёвы і музычны профілі. А на апошніх пазіцыях у рэйтынгу — факультатывы тэхналагічнага, экалагічнага і ваенна-патрыятычнага зместу.

«Мы не можам папракаць бацькоў за іх імкненне даць дзецям бясплатную моўную або эстэтычную адукацыю. Але, як той казаў, «за дзяржаву крыўдна», бо ваенна-патрыятычны профіль на першай і другой ступенях школы практычна не запатрабаваны, — падзяліўся сваімі думкамі з педагогамі Міхаіл Міроньчык. — Лічбы — рэч упартая. Толькі ўдумайцеся: ад агульнай колькасці гадзін, выдзеленых на факультатывы, на заняткі ваенна-патрыятычнага кірунку прыпадае толькі 0,2 гадзіны ў сярэднім па горадзе. Збольшага гэта характарызуе работу педагагічных калектываў па ваенна-патрыятычным выхаванні. Не лепшая сітуацыя складваецца і з факультатывамі тэхналагічнай накіраванасці. І гэта ва ўмовах актуалізацыі працоўнага выхавання...»

## Рабочыя прафесіі не прапаноўваць

Паказчыкаў, якія характарызуюць эфектыўнасць сталічнай сістэмы адукацыі, шмат: 100% дашкольнікаў падрыхтаваных да навучання ў школе; 76% выпускнікоў мінскіх школ працягнуць навучанне ў вышэйшых навучальных установах; з 2000 года каманда горада лідзіруе на рэспубліканскіх прадметных алімпіядах; мінскія школьнікі штогод становяцца пераможцамі і прызёрамі міжнародных алімпіяд і конкурсаў; у сістэму агульнай сярэдняй адукацыі інтэгравана 76% ад агульнай колькасці дзяцей школьнага ўзросту з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця і гэтак далей. Але і яны патрабуюць крытычнага асэнсавання. Узяць тое ж уладкаванне ў жыцці выпускнікоў школ. На працягу многіх гадоў **у сталіцы захоўваецца дыспрапорцыя паміж колькасцю выпускнікоў, якія паступаюць у прафесійна-тэхнічныя і вышэйшыя навучальныя ўстановы: сёння гэтыя суадносіны 1 да 14.** Толькі 13,5% выпускнікоў базавай і 5,3% выпускнікоў сярэдняй школы будуць навучацца ва ўстановах сістэмы прафтэхадукацыі.

**«На жаль, нярэдка паступленне дзіцяці ў гімназію становіцца задавальненнем менавіта бацькоўскіх амбіцый».**

— Пагадзіцеся, што гэта свайго роду ацэнка нашай работы па прафарыентацыі, павышэнні прывабнасці сістэмы прафтэхадукацыі для моладзі і фарміраванні заказу на адукацыйныя паслугі, — звярнуўся да ўдзельнікаў форуму Міхаіл Міроньчык. — Пры гэтым гораду вельмі патрэбны кваліфікаваныя рабочыя кадры. На жаль, мы пакуль не можам сур'ёзна паўплываць на пазіцыю бацькоў, якія лічаць, што хоць які-небудзь дыплом аб вышэйшай адукацыі іх дзіця павінна атрымаць, нярэдка без матывацыі да прафесійнай дзейнасці і перспектыў працаўладкавання па спецыяльнасці. Спадзяёмся, што ўкараненне даПрофільнай і дапрафесійнай падрыхтоўкі зменіць гэту сітуацыю... У маштабах горада ўжо робіцца першыя крокі, у прыватнасці распрацаваны маршруты вытворчага турызму; ва ўстановах дадатковай адукацыі ўводзіцца новы кірунку дапрафесійнай падрыхтоўкі. Эфектыўныя рашэнні мы чакаем і ад упраўленняў і ўстаноў адукацыі.

## Амбіцыі ці патрэба часу?

Аб'ектыўны матэрыял для ацэнкі якасці адукацыі даюць вынікі цэнтралізаванага тэсціравання як адна- го з элементаў знешняга кантролю якасці ведаў. Сёлета ў ЦТ прынялі ўдзел амаль 90% выпускнікоў мінскіх школ. Сярэдні набраны бал па ўсіх прадметах — 47,1, а па французскай, нямецкай мовах і хіміі — больш як 50 балаў. У параўнанні з абласнымі цэнтрамі сярэдні бал у выпускнікоў мінскіх школ вышэйшы па дзевяці прадметах.

Абсалютныя вынікі (100 балаў) паказалі сёлета па краіне 303 удзельнікі ЦТ у 314 выпадках, амаль трэць з іх — выпускнікі мінскіх школ, гэта больш, чым у мінулым годзе. Па двух прадметах 100 балаў набралі 11 абітурыентаў, чацвёра з іх — мінскія школьнікі (выпускнікі гімназій №№7, 13, 41 і ліцэя №1).

Аб узроўні ведаў вучняў, якія завяршылі навучанне ў пачатковай школе, у пэўнай ступені можна меркаваць па выніках уступных выпрабаванняў у 5-я класы гімназій. Сёлета ў іх удзельнічала амаль трэцяя частка ад агульнай колькасці выпускнікоў 4-х класаў. 88% з іх атрымалі адзнакі ад 8 да 10 балаў. Міхаіл Міроньчык канстатуе: з 2014 па 2017 год больш чым утрая павялічылася колькасць вучняў, якія ў суме набралі максімальныя 60 балаў. Сёння гэта кожны дзясяты з тых, хто прымаў удзел у конкурсным адборы.

— Вынікі годныя, але нам яшчэ трэба будзе іх прааналізаваць, як і іншыя нюансы фарміравання гімназічных класаў. Пакуль жа ў наяўнасці магутная матывацыя бацькоў да навучання дзяцей у гімназіях і выкарыстанне ўсіх магчымых шляхоў іх падрыхтоўкі да ўступных іспытаў. На жаль, нярэдка паступленне дзіцяці ў гімназію становіцца задавальненнем менавіта бацькоўскіх амбіцый, — лічыць старшыня камітэта па адукацыі. — Напэўна, іх можна зразумець, хоць і цяжка. **Калі ў традыцыі чацвёртакласнікаў настольнымі кнігамі з'яўляюцца зборнікі тэкстаў для ўступных выпрабаванняў, — гэта павінна нас як мінімум насцярожыць.** Бацькам трэба дапамагчы ўсвядоміць, што ў школы, акрамя галоўнай задачы па навучанні дзяцей, ёсць і іншыя: гэта фарміраванне і развіццё ў малодшых школьнікаў сацыяльных кампетэнцый, даследчых навыкаў, якасцяў асобы, якія шмат у чым вызначаюць пасяховасць навучання на больш высокіх ступенях атрымання адукацыі.



Творчы погляд на школьную рэчаіснасць выхаванцаў устаноў дадатковай адукацыі сталіцы.

## Маленькія хамелеоны...

Асобна Міхаіл Міроньчык спыніўся на выхаваўчых аспектах у педагагічнай працы:

— Галоўнай задачай для нас было, ёсць і будзе выхаванне патрыятызму, пачуцця гонару за краіну і гатоўнасць адстойваць яе нацыянальныя інтарэсы ў любой сітуацыі. Шмат было сказана пранікліўых і правільных слоў на гэтую тэму: пра тое, што ў патрыятычнага выхавання няма меж; што ідэалогія пранізвае ўсе бакі адукацыйнага працэсу; казалі пра ролю настаўніка як правадніка патрыятычных поглядаў; аб захаванні гістарычнай памяці беларускага народа; пра неабходнасць ствараць умовы для праяўлення маладымі людзьмі грамадзянскай самастойнасці і адказнасці і пра многае іншае. Але інфляцыя слоў, якая апошнім часам мае месца, не можа і не павінна засланіць сутнасць ідэй патрыятычнага выхавання.

Старшыня камітэта па адукацыі ўпэўнены: арэна ідэалагічных бітваў — гэта не толькі міжнародныя дыскусіі або дэбаты на ўсіх тэлевізійных каналах, як правіла, з удзелам адных і тых жа асоб. Гэта таксама і гутаркі бацькоў на кухні, і размовы з сябрамі ў двары, і паўсядзённыя кантакты з аднакласнікамі і настаўнікамі ў школе.

— Новы фармат ідэалагічнага выхавання, на наш погляд, заключаецца ў фарміраванні ў дзяцей, іх бацькоў і педагогаў унутраных грамадзянскіх ацэначных пазіцый. А для гэтага неабходна, каб у дарослых словы не разыходзіліся з учынкамі, і яны былі для дзяцей ва ўсіх сітуацыях — ад бытавых да грамадска-палітычных — эталонам сумленнасці і цвёрдасці перакананняў. Каб дзеці перасталі быць гэткімі хамелеонамі, маніпулятарамі, якія ведаюць, у якой сітуацыі, каму і што сказаць і што зрабіць (гэтаму яны ў нас навучыліся!), — падзяліўся сваім бачаннем праблемы Міхаіл Міроньчык. — Задача перад намі стаіць няпростая — фарміраваць у дзяцей усвядомленую патрэбу заўсёды быць самімі сабой, быць такімі, як іх вучылі, — патрэбнымі сваёй сям'і, грамадству і краіне.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**
*nikalaeva@zviazda.by*

# ПРА СЛАВУТАСЦІ БЕЛАРУСІ — НА ЗАМЕЖНАЙ МОВЕ

## Будуць расказваць школьнікі турыстам

**Больш за тысячу чалавек: настаўнікі, спецыялісты, бацькі, прадстаўнікі грамадскіх арганізацый, прафсаюзаў, дзяржаўных органаў улады прынялі ўдзел у мінскай абласной педагагічнай канферэнцыі ў Маладзечне. Удзельнікі форуму абмеркавалі актуальныя пытанні галіны, у тым ліку і асаблівасці арганізацыі адукацыйнага працэсу ва ўмовах профільнага навучання, работу па абноўленых праграмах і новых дапаможніках.**

Як адзначыла **намеснік міністра адукацыі Беларусі Раіса СІДАРЭНКА**, у абмеркаванні абноўленых праграм з мая па жнівень прыняло ўдзел каля 5 тыс. педагогаў, якія ўнеслі свае заўвагі і прапановы. Яна асабліва падкрэсліла, што кожны ўрок, мерапрыемства павінны несці перш за ўсё выхаваўчую нагрузку. Менавіта гэты прынцып улічаны ў абноўленых праграмах. Калі раней на ўроках англійскай мовы дзяцей вучылі расказваць аб славутасцях і выдатных мясцінах Туманнага Альбіёна, то цяпер акцэнт робіцца на тое, каб яны маглі замежным гасцям прадставіць сваю краіну.

**Начальнік упраўлення адукацыі Мінаблвыканкама Галіна КАЗАК** звярнула ўвагу на тое, што з кожным годам школьнікі цэнтральнага рэгіёна паказваюць больш якасныя веды. Пра гэта сведчыць колькасць выпускнікоў, якія заканчваюць школу з залатымі і сярэбранымі медалямі, узнагароды, дыпломы з розных міжнародных форумаў, алімпіяд. На працягу трох гадоў каманда прадстаўнікоў Міншчыны займае другое месца на рэспубліканскім конкурсе даследчыкаў. А на рэспубліканскіх прадметных алімпіядах сёлета каманда цэнтральнага рэгіёна атрымала 82 дыпломы і стала трэцяй. «Гэта вынік прафесійнай падыходу педагогаў. Менавіта ад іх залежыць якасць навучання», — канстатавала Галіна Казак.

**Старшыня Мінскага аблвыканкама Анатоль ІСАЧАНКА** падкрэсліў таксама, што ў галіне ўдалося дасягнуць поспехаў. У тым ліку, і па даступнасці адукацыі, павышэнні якасці ведаў. Як вынік, дзеці дастойна прадстаўляюць вобласць і Беларусь на замежных конкурсах, мерапрыемствах рознага кшталту. Акрамя таго, на Міншчыне будуюцца новыя школы і дашкольныя ўстановы.

Толькі за апошнія паўтара года адкрыта пяць дзіцячых садкоў і адна школа, значная ўвага ўдзяляецца дзяржаўна-прыватнаму партнёрству. За сродкі інвестараў у Мінскім раёне пабудаваны тры дзіцячыя садкі, заканчваецца ўзвядзенне яшчэ аднаго.

Кіраўнік вобласці лічыць, што неабходна больш увагі ўдзяляць прафарыентацыі вучняў, якая дапаможа зрабіць выбар будучай спецыяльнасці. Анатоль Ісачанка асабліва падкрэсліў, што павышэнню якасці падрыхтоўкі па рабочых прафесіях на Міншчыне будзе ўдзяляцца першаступенная ўвага. «Неабходна больш цесна кантактаваць з кіраўнікамі прадпрыемстваў, для якіх ліцэі і каледжы рыхтуюць кадры па дагаворах, пастаянна арганізоўваць вытворчую практыку, забяспечваць навучальныя ўстановы менавіта ўзорамі таго абсталявання, на якім яны будуць затым працаваць. У гэтым кірунку Мінаблвыканкам ужо пачаў работу», — канстатаваў кіраўнік цэнтральнага рэгіёна.

Падчас форуму працавалі інтэрактыўныя пляцоўкі, выставы, прэзентацыі. Тут можна было азнаёміцца з дасягненнямі ў галіне адукацыі, вопытам правядзення шостага школьнага дня, паўдзельнічаць у майстар-класах. Завяршыўся форум узнагароджаннем найлепшых педагогаў, ушанаваннем маладых спецыялістаў і педагогаў, якія будуць прадстаўляць Міншчыну на Рэспубліканскім конкурсе прафесійнага майстэрства педработнікаў «Настаўнік года Рэспублікі Беларусь».

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.**
*lazovskaya@zviazda.by*

■ Запрашальнік

# Чатыры стагоддзі друкарні

## У Любчы адбудзецца тэатралізаванае шэсце з нагоды памятных дат

**У мястэчку Любча ў Навагрудскім раёне 3 верасня адбудзецца свята «Друкаванае слова ў Любчы». Яно будзе прысвечана 500-годдзю беларускага кнігадрукавання і 405-годдзю мясцовай друкарні. У Любчанскім замку з гэтай нагоды будзе закладзена капсула з пасланнем.**

Адкрыецца дзея ўрачыстым тэатралізаваным шэсцем гасцей і жыхароў Любчы ад замка да асноўнай сцэны. Запланаваныя сустрэчы з паэтамі, фэст літаратурных герояў, парад рэдкіх кніг, работа інтэрактыўнай бібліятэчнай пляцоўкі. Працягнецца свята канцэртам народнага ансамбля музыкі, песні і танца «Белыя Росы», выступленнямі аматарскіх калектываў рэгіёна. У завяршэнне адбудзецца баль для моладзі.

За часам, на жаль, не захавалася ні друкарня, ні яе абсталяванне. Цяпер нават невядома, дзе дакладна ў Любчы яна знаходзілася. Затое захавалася дакладная дата яе стварэння — 27 лютага 1612 года. Яе заснавальнік, друкар Пётр Бластус Кміта прыехаў у Любчу з Вільні, ратуючыся ад праследу езуітаў.

Даследчыкі лічаць Любчанскую друкарню фенаменальнай: ні адна пратэстанцкая друкарня ў Вялікім Княстве Літоўскім не існавала так доўга, як гэта. Прадстаўнікі розных саслоўяў і веравызнанняў мелі магчымасць друкаваць у ёй свае творы. Прычым з друкарскіх варштатаў выходзілі не толькі рэлігійныя тэксты, нямала было выдадзена медыцынскай, навуковай літаратуры, выдавалі навуковыя дапаможнікі і нават свецкія раманы.

Усяго вядома пра трох друкароў у Любчы. Да выдавецкай справы далучыўся сын Пятра Кміты Ян Даніэль. Апошнім трэцім выдаўцом быў эмігрант з Польшчы Ян Лангэ. Эпідэміі і войны XVII стагоддзя знішчылі Любчу. З тых часоў кнігавыданне ў ёй не аднаўлялася.

**Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ.** *nina@zviazda.by* ■

■ Філатэліст

# Марка ад Скарыны

**1 верасня Міністэрства сувязі і інфарматызацыі выпускае ў абарачэнне паштовы блок «500-годдзе беларускага кнігадрукавання»**

У аснове маркі — старонка з Псалтыра. Праект падрыхтаваны ў супрацоўніцтве з Нацыянальнай бібліятэкай Беларусі. Мастак — Таццяна Дольская. Дызайн Марыны Віткоўскай. У дзень выпуску паштовага блока ў абарачэнне ў аддзяленні сувязі №1 Мінска (крама «Філатэлія», вуліца Маскоўская, 16) будзе праводзіцца спецыяльнае гашэнне на канверце «Першы дзень».

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.**
*lubneuskaya@zviazda.by* ■



ЧЫРВОНКА
ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА

31 ЖНІЎНЯ 2017 г.
ЧАЦВЕР
№16 (15823)

Выдаецца
з 21 красавіка 1921 года




Імёны

## Яўгенія СЦЯПАНАВА:
# «Нават на трэніроўкі прыходжу ў сукенках»

**У свае 22 яна ўжо капітан жаночай каманды сталічнага баскетбольнага клуба «Цмокі». Пераможны настрой дзяўчат, парадак у камандзе, эмацыянальны фон калектыву — гэта яе задачы, з якімі маладая спартсменка, мяркуючы па ўсім, спраўляецца на выдатна. У сезоне 2016/17 «Цмокі» сталі ўладальнікамі Кубка Беларусі і выйгралі чэмпіянат краіны. А дзяўчыну ўпершыню запрасілі ў нацыянальную зборную, дзе далі шанц праявіць сябе. Што думае пра будучыню жаночага баскетбола Яўгенія Сцяпанава, як ёй удаецца сумяшчаць спорт з неймавернай жаноцкасцю і якія якасці важныя для дасягнення поспеху, спартсменка расказала ў сваім інтэрв'ю.**

***— Мінулым сезонам засталіся задаволены?***

— Ён склаўся, на мой погляд, вельмі паспяхова. Хоць у пачатку года я нават не магла марыць пра такі сцэнарый, бо ў нас вельмі маладая каманда. Разлічвалі, што пазмагаемся і за кубак, і за званне чэмпіёна краіны, але апасаліся вопыту сапернікаў. Аднак да адказных гульняў падышлі з вялікім энтузіязмам і выйгралі гэтыя турніры. Адзінае, яшчэ лепш хацелася б згуляць на міжнароднай арэне. Сёлета склад каманды застаўся практычна той жа, за выключэннем таго, што мы «ўзмацніліся» амерыканкамі. Будзем праводзіць работу над памылкамі, бо планку паніжаць ужо не хочацца.

***— Вясной вы ўпершыню атрымалі запрашэнне ў галоўную каманду краіны...***

— Даўно хацела трапіць у зборную, і было вельмі прыемна, што маю працу заўважылі і ацанілі. Сваёй гульнёй на турніры Халіпскага засталася незадаволеная, хоць на зборах выкладвалася па поўнай. Але выдатна разумею, што дрэнны вопыт — гэта таксама вопыт і штуршок да таго, каб працаваць яшчэ больш. На турніры ў Кітаі паказала сябе ўжо лепш.

***— У зборную трапілі ў няпросты перыяд, калі яе пакінулі лідары...***

— Так, у моладзі няшмат вопыту, але ўсё роўна трэба працаваць і старацца быць сапраўднай камандай. Не ведаю, што чакае жаночы беларускі баскетбол у будучыні, але хацелася б верыць, што з кожным годам наша становішча будзе паляпшацца. Ведаеце, пастаянна спадзявацца толькі на вопытных гульцоў таксама нельга, час ужо і нам уносіць сваю лепту ў развіццё баскетбола ў краіне.

*(Заканчэнне на 8-й стар. «ЧЗ».)*

Да самай сутнасці

# ПРЫЦЯЖЭННЕ КЕРНУ,

## або Мільён гадоў у скрыні

**Што з сябе ўяўляе праца геолага? Першае, што прыходзіць на розум, — бясконцая работа «ў полі», рамантыка вечаровых пасядзелак з гітарай каля вогнішча, пошукі карысных выкапняў і кантакт з унікальнымі матэрыяламі з нетраў Зямлі. Каб даведацца, ці адпавядае прафесія шматлікім стэрэатыпам, карэспандэнты «Чырвонкі. Чырвонай змены» паназіралі за двума маладымі геолагамі: спачатку «ў полі», а пасля і ў лабараторыі.**

### «ПАРОДЗІСТАЯ» РАБОТА

...На заднім двары будынка Слуцкай геолагаразведачнай партыі праца апоўдні кіпіць — паўсюль размешчаны спецыяльныя драўляныя скрыні з секцыямі, у кожнай з якіх захоўваюцца кавалкі керну — узоры проб горнай пароды, здабытыя бурам са свідравіны пад Быхавам. Дзесьці гэта рассыпістая, як пясок, субстанцыя няпэўнага адцення, у іншых месцах — цвёрдыя, як камень, слупкі ледзь не ўсіх колераў вясёлкі. На невялікай пляцоўцы, у пераносным сэнсе слоў, змяшчаюцца сотні мільёнаў гадоў геалагічнай гісторыі Зямлі. Побач сканцэнтравана працуе група геолагаў з чатырох чалавек. Яны робяць палявое апісанне — карпатліва, сантыметр за сантыметрам, візуальна і тактыльна аналізуюць керн, запісваючы ўсе звесткі ў палявыя кніжкі. Адзін з іх — **інжынер аддзела геалогіі і мінерагеніі платформеннага чахла філіяла «Інстытут геалогіі» рэспубліканскага ўнітарнага прадпрыемства «Навукова-вытворчы цэнтр па геалогіі» Сяргей МАНКЕВІЧ.**

*(Заканчэнне на 4-й стар. «ЧЗ».)*


Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

Часам керн больш нагадвае звычайны камень.

Даведацца пра галоўнае

# ЯКОЕ Ж ЯНО СКЛАДАНАЕ... ДАРОСЛАЕ ЖЫЦЦЁ

## У ТОПе жыццёвых каштоўнасцяў — сям'я, здароўе і адукацыя

**Эмацыянальнае самаадчуванне школьніка, жыццёвыя каштоўнасці і ўстаноўкі старшакласнікаў, прычыны ўзнікнення крызісных сітуацый і многія іншыя важныя аспекты аказаліся ў цэнтры ўвагі рэспубліканскага маніторынгу, праведзенага Нацыянальным інстытутам адукацыі па заказе Міністэрства адукацыі.**


Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

### Упэўненасць ці трывога?

Адным з найважнейшых паказчыкаў эмацыянальнага камфорту асобы з'яўляецца задаволенасць сабой і сваім жыццём. Як паказалі адказы старшакласнікаў, найбольш спрыяльнай для іх з'яўляецца сфера сямейных адносін: імі задаволены 86,4% апытаных. У крыху меншай ступені хлопцы і дзяўчаты задаволены адносінамі з аднакласнікамі і настаўнікамі (74 і 76% адказаў «задаволены»). Разважаючы аб заўтрашнім дні, большасць вучняў старшых класаў адчуваюць надзею, аптымізм (71,5%), спакой і ўпэўненасць (68,3%). У той жа час у кожнага дзясятага рэспандэнта думкі пра будучыню выклікаюць трывогу і няўпэўненасць (11,3%), а каля аднаго працэнта адказалі, што яны адчуваюць страх і адчай.

Важны фактар, які абумоўлівае стрэсаўстойлівасць асобы і эфектыўнасць пераадолення жыццёвых цяжкасцяў, — вера ва ўласныя сілы, якая дапамагае рэалізоўваць свае жыццёвыя мэты, ісці наперад, нягледзячы на абставіны. Амаль дзве трэці рэспандэнтаў (65,7%) адказалі адназначна станоўча, што яны вераць у сябе і свае сілы. 31,2% хоць і адчуваюць некаторыя сумненні, усё ж стараюцца пазітыўна ацэньваць свае магчымасці. Прыкладна столькі ж вучняў адзначылі, што для больш шчаслівага жыцця і паспяховага вырашэння праблем ім не хапае такой якасці, як упэўненасць у сабе.

### «Я падумаю пра гэта заўтра»

У сілу гендарных асаблівасцяў ад няўпэўненасці ў сабе часцей церпяць дзяўчаты, юнакі ж менш схільныя прызнавацца ў сваіх недахопах, уласных праблемах і ў большай ступені вераць у сябе і ва ўласныя сілы.

Большасць старшакласнікаў бачаць сэнс жыцця чалавека, і адпаведна сэнс свайго жыцця, у дасягненні канкрэтных жыццёвых мэтаў (69,3%), што цалкам суадносіцца з агульнай прагматычнай скіраванасцю сучаснага грамадства.

*(Заканчэнне на 2-й стар. «ЧЗ».)*

Падзея

# ДА ЯДНАЮЧАГА РАМОНКА

## ЕДЗЕ МОЛАДЗЬ НА ФЕСТЫВАЛЬ У СОЧЫ



Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

**300 чалавек увойдуць у дэлегацыю, якая прадставіць Беларусь на XIX Сусветным фестывалі моладзі і студэнтаў у Сочы.**

Мерапрыемства пройдзе з 14 па 22 кастрычніка і збярэ больш як 20 тысяч маладых людзей са 150 краін свету. На адной пляцоўцы сустрэнуцца прадстаўнікі маладзёжных грамадскіх арганізацый і прафсаюзныя лідары, маладыя журналісты і палітыкі, творчая і спартыўная моладзь, маладыя інжынеры і навукоўцы, выкладчыкі ВНУ і прадстаўнікі студэнцкага самакіравання.

Арганізатарам будзе дапамагаць добраахвотніцкі корпус #ВолонтерыМира, у склад якога ўвойдуць 5000 добраахвотнікаў як з Расіі, так і з іншых краін свету, у тым ліку і беларусы. Набор валанцёраў быў абвешчаны загадзя...

Беларусь як суверэнная краіна возьме ўдзел у Сусветным фестывалі моладзі і студэнтаў трэці раз: упершыню нашы хлопцы і дзяўчаты паўдзельнічалі ў фестывалі, які праводзіўся ў 1997 годзе на Кубе, а другі раз — у Венесуэле (у 2005 годзе).

— Беларуская дэлегацыя — не проста вялікая (а расіяне выдзелілі для нас адну з самых вялікіх квот) — яна інтэлектуальная, таленавітая і крэатыўная, — падкрэсліве **намеснік начальніка ўпраўлення па справах моладзі Міністэрства адукацыі Таццяна СІМАНОЎСКАЯ.** — Члены дэлегацыі падбіраліся такім чынам, каб мы маглі паўдзельнічаць ва ўсіх мерапрыемствах, прадугледжаных праграмай фестывалю: дыскусійнай, культурнай, спартыўнай, навукова-адукацыйнай і гэтак далей.

Упершыню ў гісторыі фестывальнага руху ў грандыёзным маладзёжным свяце будзе задзейнічана ўся краіна. У рамках форуму запланавана рэгіянальная праграма: больш як 1,5 тысячы замежных удзельнікаў у першыя тры дні свайго знаходжання ў Расіі наведаюць 15 розных рэгіёнаў — ад Калінінграда да Уладзівастока.

Старт фестывалю дасць міжнародны парад-карнавал, які адбудзецца 14 кастрычніка ў Маскве. Там жа збяруцца, каб абмеркаваць перспектывы маладзёжнай палітыкі, і кіраўнікі ведамстваў, якія адказваюць за яе рэалізацыю, з усіх краін-удзельніц мерапрыемства. Беларусь будзе прадстаўляць міністр адукацыі Ігар Карпенка. Ён жа і ўзначаліць беларускую дэлегацыю.

— Для Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі была выдзелена квота ў 30 месцаў, а ахвотных было ўтрая больш, — паведаміў **старшыня Маладзёжнага савета Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі Арцём ІГНАЦЕНКА,** — таму мы імкнуліся падабраць сваіх дэлегатаў так, каб яны маглі прадставіць дзейнасць федэрацыі па самых розных кірунках. Тым больш што прафсаюзнаму руху будзе прысвечаны на фестывалі асобны блок. Гэта і прадстаўнікі нашых прафсаюзных здраўніц (а такім багажом можна пахваліцца далёка не кожны прафсаюз), прадпрыемстваў «Белшына», «Белмедпрэпараты», «БелАЗ», «Барысаўскі завод медпрэпаратаў», маладыя навукоўцы, прафсаюзныя лідары...

Для Беларускага рэспубліканскага саюза моладзі выдзелілі квоту ў 70 чалавек. У кола шчаслівцаў трапілі пераможцы рэспубліканскага конкурсу «100 ідэй для Беларусі», конкурсу «Аўталэдзі-2016», леташняга конкурсу «Уладар сяла», найлепшыя байцы маладзёжных атрадаў аховы правапарадку...

Па словах Таццяны Сіманоўскай, для ўдзельнікаў фестывалю ўстаноўлены ўзроставы цэнз — ад 18 да 35 гадоў: «Вельмі скрупулёзна адбіраючы кожнага кандыдата, мы спрабавалі захаваць адначасова і гендарную роўнасць. А ўвогуле пра сваё жаданне паехаць у Сочы заявілі каля 1000 маладых чалавек, таму конкурс склаў тры чалавекі на месца».

Прадстаўніца галоўнага адукацыйнага ведамства паведаміла, што Беларусь будзе прадстаўлена ў Сочы таксама і на самай буйной выставачнай пляцоўцы. Асноўны змест нашай экспазіцыі прысвечаны папулярызацыі беларускай адукацыі, а таксама магчымасцям краіны ў правядзенні буйных спартыўных спаборніцтваў і маладзёжнаму турызму.

— Зараз завяршаецца работа над эскізамі адзінай для ўсіх членаў беларускай дэлегацыі формы, — дадала Таццяна Сіманоўская. — Прадугледжана два камплекты адзення: парадны — для ўдзелу ва ўрачыстых мерапрыемствах і больш зручны — спартыўны, які ўключае штаны, красоўкі, майку-пола, модныя ў моладзі бомберы... У адзенні абавязкова захаваюцца і нацыянальныя матывы. У дзявочых блузах і кашулях для хлопцаў прадугледзяць элементы вышыванкі з нацыянальным арнаментам. Аўтары эскізаў і вытворцы формы для сочынскай дэлегацыі — прадпрыемствы канцэрна «Беллегпрам».

Дарэчы, рабочымі мовамі фестывалю абраныя афіцыйныя мовы ААН: англійская, арабская, іспанская, кітайская, руская і французская, таму свабоднае валоданне замежнай мовай не было абавязковым крытэрыем пры адборы членаў нашай дэлегацыі. Тым не менш без яе ведання будзе праблематычна ўстанаўліваць сяброўскія стасункі.

Кожны дзень, у адпаведнасці з традыцыямі фестывальнага руху, будзе прысвечаны аднаму з макрарэгіёнаў планеты: Амерыцы, Блізкаму Усходу, Азіі і Акіяніі, Еўропе і Расіі як гаспадыні мерапрыемства. Акрамя таго, у кожнага дня будзе свая скразная тэма, якая аб'ядноае панэльныя дыскусіі, канферэнцыі і семінары: сярод іх культурнае ўзаемадзеянне, міжнародная бяспека, адукацыя, навука і навакольнае асяроддзе, IT-сфера. Будуць закранацца таксама пытанні, звязаныя з працаўладкаваннем моладзі, праблемы экалогіі і іншыя.

Сімвалам фестывалю стаў рознакаляровы рамонак, які сімвалізуе пераемнасць традыцый, сувязь пакаленняў, мір і адзінства ўсёй сусветнай супольнасці. Па яго выніках плануецца прыняць зварот моладзі з усяго свету да міжнароднай грамадскасці. Адна з галоўных ідэй форуму — фарміраванне вобраза будучыні свету, над якім і будуць працаваць удзельнікі фестывалю.

**Надзея НІКАЛАЕВА.** *nikalaeva@zviazda.by*

# ЯКОЕ Ж ЯНО СКЛАДАНАЕ... ДАРОСЛАЕ ЖЫЦЦЁ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)*

Практычна дзве трэці апытаных адзначылі, што галоўнае ў іх жыцці — гэта рэалізацыя сваіх здольнасцяў і самаўдасканаленне, што на 13% больш, чым у папярэднім даследаванні. На трэцяй па папулярнасці пазіцыі знаходзяцца сацыяльна-арыентаваныя каштоўнасныя ўстаноўкі з альтруістычнай скіраванасцю: стасункі з сябрамі і імкненне прыносіць карысць і радасць навакольным адзначыла большая палова апытаных. Далей па ступені важнасці для сучасных старшакласнікаў ідуць такія жыццёвыя арыенціры, як пазнанне навакольнага свету (45,8%) і імкненне мець усё неабходнае для цікавага жыцця (32,5%). Каля 12% апытаных адказалі, што сэнс для іх заключаецца ў тым, каб **жыць сёння, не задумваючыся пра заўтрашні дзень.** І менш за адзін працэнт удзельнікаў пакуль не задумваліся над гэтым пытаннем.

Першае месца ў іерархіі жыццёвых каштоўнасцяў навучэнцаў займае сям'я (каля 85% апытаных). Далей ідуць такія каштоўнасці, як здароўе (73,7%) і добрая адукацыя (65,3%).

Большая палова рэспандэнтаў таксама адзначылі, што для іх вельмі важныя стасункі з сябрамі і каханне (57 і 59 працэнтаў адказаў адпаведна). Далей ідуць такія каштоўнасці, як свабода асобы, душэўнасць, дабрыня (прыблізна па 38% адказаў). Немалаважнае значэнне для сучаснага пакалення мае і **матэрыяльны дабрабыт: ён з'яўляецца жыццёвым прыярытэтам для кожнага трэцяга старшакласніка** і нярэдка больш важны, чым духоўнае развіццё і самапазнанне (28% адказаў).

Для пэўнай часткі навучэнцаў важныя забавы і задавальненні (каля 20% адказаў). Іншыя лічаць прыярытэтам самарэалізацыю ў творчасці і веру ў Бога (19,9% і 13,5% адпаведна). Завяршае спіс каштоўнасцяў рызыка і вострыя адчуванні (7,5% адказаў), якія могуць увасабляцца ў розных экстрэмальных забавах.

## Грэх ці права чалавека?

Базавай устаноўкай, якая дапамагае пераадольваць цяжкасці і папярэджваць узнікненне крызіснага стану, думак і ўчынкаў, скіраваных на самаразбурэнне, з'яўляецца адчуванне каштоўнасці і непаўторнасці свайго ўласнага жыцця, уяўленне пра сябе, як пра ўнікальную асобу. Большасць навучэнцаў (73,5%) выказалі поўную згоду са сцверджаннем «Маё жыццё мае асаблівую каштоўнасць і сэнс, якія б я ні перажываў цяжкасці». 21% апытаных, хоць і з пэўнай доляй сумнення, таксама схіляюцца да гэтай думкі. У той жа час ёсць старшакласнікі (іх каля 5%), якія не бачаць асаблівай каштоўнасці і сэнсу ў сваім жыцці.

Устаноўку «Калі я не дасягну таго, чаго хачу, то ўсё страціць свой сэнс» схільныя раздзяліць 13% навучэнцаў. І прыблізна 3% апытаных патрабуецца кваліфікаваная псіхалагічная дапамога.

Большасць старшакласнікаў згодныя з тым, што, пазбаўляючы сябе жыцця, чалавек паддаецца ўплыву абставін, адмаўляецца змагацца. Увогуле ў адносінах да праблемы самагубства найбольш распаўсюджаныя наступныя пункты погляду: «Самазабойства — гэта праява слабасці» ці «Самазабойства недапушчальнае, гэта страшны грэх». У той жа час каля 10 працэнтаў навучэнцаў лічаць, што самазабойства — асабістае права чалавека, меркаванне, што суіцыд можа быць эфектыўным спосабам адыходу з жыцця, схільныя раздзяліць 8,3% навучэнцаў.

У хлопцаў і дзяўчат пераважае аптымістычны настрой, большасць з іх упэўнены, што ў жыцці заўсёды можна знайсці пазітыўныя моманты. Аднак адказы некаторай часткі старшакласнікаў сведчаць пра наяўнасць у іх установак, уласцівых дэпрэсіўнаму ўспрыманню свету. Так, каля 17% апытаных прызналіся, што ім падабаюцца музыка і вершы, у якіх распавядаецца пра адзіноцтва чалавека, бязвыхаднасць жыцця, сыход у іншую рэчаіснасць...

На думку спецыялістаў, трывожным сімптомам, разам з іншымі праявамі дэпрэсіі і дэзадаптацыі, з'яўляецца нездаровы інтарэс да тэм, звязаных з замагільнымі светам і жыццём, які назіраецца ў 15% навучэнцаў.

Пэўную ролю ў фарміраванні падобных установак іграюць асобныя маладзёжныя субкультуры, якія культывуюць тэмы смерці, адзіноцтва і незямной рэчаіснасці. Часта гэта звязана з захапленнем акультызмам, магіяй, чаму ў многім спрыяе сучасная масавая культура.

Ускладняе дэпрэсійны стан уласцівая падлеткаваму ўзросту схільнасць замыкацца ў сабе, нежаданне звяртацца да дарослых па дапамогу, дзяліцца сваімі перажываннямі. Каля 40% апытаных старшакласнікаў схільныя лічыць, што «наўрад ці хтосьці можа зразумець іх унутраны свет, перажыванні і пакуты».

Як сцвярджаюць псіхолагі, для прафілактыкі суіцыдальных паводзін і дэпрэсіўнага стану вялікае значэнне мае ўменне падтрымліваць пазітыўныя адносіны з навакольнымі і знаходзіць задавальненне ў стасунках з іншымі людзьмі, занятымі любімай справай. Але **амаль кожны дзясяты старшакласнік сёння лічыць камп'ютарныя гульні і камунікацыю ў інтэрнэце больш цікавымі за рэальнае жыццё.**

**Для даведкі**

**Даследаванне праводзілася метадам анкетавання і ахапіла 778 навучэнцаў X і XI класаў. Больш падрабязна з вынікамі маніторынгу можна пазнаёміцца на нацыянальным адукацыйным партале www.adu.by у раздзеле «Педагогам/ацэнка якасці адукацыі».**

## Калі хочацца збегчы з дому...

Прычын узнікнення крызісных сітуацый у жыцці маладых людзей шмат: гэта перажыванні з-за няшчаснага кахання (53% рэспандэнтаў), складаныя стасункі з равеснікамі (49,7%), праблемныя адносіны з бацькамі (47,8%), няўдачы ў вучобе (40%), спажыванне алкаголю і наркотыкаў (30,8%), страх пакарання ці ганьбы, боязь не апраўдаць чаканні бацькоў, канфлікты з настаўнікам, прыніжэнне, ціск з боку педагога...

Высветлілася, што далёка не ўсе старшакласнікі могуць расказаць бацькам пра тое, што іх хвалюе: 27% навучэнцаў адзначылі, што яны могуць толькі зрэдку абмеркаваць з імі свае праблемы. Каля васьмі працэнтаў бацькоў таксама канстатавалі, што іх дзіця вельмі рэдка дзеліцца сваімі перажываннямі. Часцей за ўсё старшакласнікі абмяркоўваюць у сям'і пытанні, звязаныя з вучобай і выбарам прафесіі, пытанні, якія датычацца іх захапленняў, узаемаадносін з аднакласнікамі і сябрамі. У той жа час толькі каля паловы апытаных адказалі, што яны могуць абмеркаваць з бацькамі пытанні сэнсу і мэтаў жыцця, яшчэ радзей старшакласнікі могуць пагутарыць з бацькамі пра ўзаемаадносіны з іншым полам, пра каштоўнасці, на якія трэба будаваць сваё жыццё.

І вось яшчэ некалькі лічбаў для роздуму: **8% старшакласнікаў адчуваюць пастаянны страх быць пакаранымі бацькамі.** Каля 13 працэнтаў увесь час баяцца асуджэння з іх боку, і больш як 5% падлеткаў адказалі, што бацькі прымяняюць у адносінах да іх фізічныя меры пакарання.

3,5 працэнта апытаных пастаянна сутыкаюцца ў сям'і з сітуацыямі, калі ім хочацца ўцячы з дому (15,4% паведамілі, што такія думкі зрэдку ў іх узнікаюць). І каля 5% апытаных сказалі, што яны не адчуваюць сябе дома ў бяспецы.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**
*nikalaeva@zviazda.by*



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

*Нішто сабе!*

# АЛІМПІЯДА Ў ВЁСЦЫ? А ЧАМУ Б І НЕ!



**У вёсцы Грабёнка, што на Чэрвеньшчыне, на летніх канікулах дзецям і падлеткам не бывае сумна. Яны з непадробным энтузіязмам удзельнічаюць у сапраўднай спартыўнай алімпіядзе. Яе, прыязджаючы ў адпачынак на радзіму жонкі, вось ужо на працягу шаснаццаці гадоў ладзіць маскоўскі тэлежурналіст Дзмітрый Жураўлёў.**

...Назва «Алімпіяда» абрана невыпадкова. У вясковых спаборніцтвах, на думку арганізатара, як і ў вялікіх гульнях, закладзены сакральны філасофскі сэнс яднання розных людзей. Там дзеці сапраўды гуртуюцца, маюць стасункі, заводзяць сяброўства.

Першыя спаборніцтвы адбыліся ў далёкім 2002 годзе.

— Спачатку мясцовыя хлопцы проста гулялі ў футбол, а я прыходзіў судзіць матчы, — успамінае Дзмітрый. — Адзін з іх прапанаваў арганізаваць спаборніцтвы не толькі па футболе. Шчыра кажучы, спачатку я яго ідэю не ацаніў. Але на наступны год пачалі падыходзіць малодшыя дзеці, якія пераконвалі мяне, што гэта вельмі цікава. Вырашылі паспрабаваць наладзіць спаборніцтвы. Ніхто нават не думаў, што ўсё будзе працягвацца так доўга. Ужо цэлых шаснаццаць гадоў! Напачатку ў Алімпіядзе ўдзельнічала недзе 25 дзяцей і падлеткаў, і нам здавалася, што гэта вельмі шмат. Сёлета толькі на бег прыйшло 56! Прыемна...

— Калі б вы ўсё ж не падтрымалі ініцыятыву дзяцей, ці змаглі б яны арганізавацца самі?

— Ёсць два вельмі важныя моманты, калі ўдзел дарослага абавязковы. Па-першае, гэта атрыманне дазволу на правядзенне спаборніцтваў. Без яго — ніяк. Напрыклад, велагонкі ў нас праходзяць вакол школы, больш няма дзе. Паводле правілаў бяспекі, туды проста так не прайсці: стаіць высокая агароджа, вароты — на замку. Нават калі б дваццаць дзяцей прыйшлі з веласіпедамі, іх усё роўна не пусцілі б. Я пайшоў у райвыканкам да начальніка аддзела адукацыі, спорту і турызму Ларысы Асановіч, і дзякуючы ёй мы паразумеліся з кіраўніцтвам школы. Па-другое, не сакрэт, што падчас спаборніцтваў здараюцца спрэчныя моманты. Таму і павінен быць дарослы суддзя, слова якога — закон.

— За шаснаццаць гадоў шмат змянілася?

— Безумоўна. Ранейшым застаецца толькі тое, што кожны год улетку тут збіраюцца хлопчыкі і дзяўчынкі — новыя і сталыя ўдзельнікі. Для іх Алімпіяда — вельмі чаканая падзея. Многія пачынаюць пытацца пра расклад і час наступных спаборніцтваў ужо ўзімку... За шаснаццаць гадоў пашырыўся ўзроставы дыяпазон удзельнікаў. Верхняя мяжа допуску засталася нязменнай — дзяўчаты да пятнаццаці гадоў, хлопцы — да чатырнаццаці, але прыходзяць зусім малыя, якія вельмі хочуць далучыцца да Алімпіяды. Былі выпадкі, калі кідалі тапак на дальнасць дзеці, якім няма яшчэ двух гадоў, а ў бегу на старт выходзілі двухгадовыя... Таксама прыкметна павялічылася агульная колькасць удзельнікаў. Змянілася стаўленне дзяцей да Алімпіяды. На першыя спаборніцтвы яны прыходзілі больш для таго, каб пабыць разам: для іх гэта было найважней, чым атрымаць грамату, заняць першае месца. Цяпер прыходзяць перамагаць. Калі дзесяць—дванаццаць гадоў таму ўдзельнік мог з'явіцца ў джынсах, пляжных шлёпанцах, нават у ботах ці паліто, і гэта было нармальна, то цяпер прыходзяць у спартыўнай форме і нацэлены толькі на перамогу. Такія драматычныя бываюць у нас спаборніцтвы, акурат як на гульнях сусветнага маштабу!



Сёння Алімпіяда ў Грабёнцы — жаданая падзея для мясцовых юных жыхароў, а таксама для мінчан, якія ўлетку бавяць тут час у сваякоў. Дзеці з суседніх вёсак таксама не лянуюцца пераадольваць некалькі кіламетраў на веласіпедах, каб паўдзельнічаць у спаборніцтвах. З кожным годам гульні развіваюцца, удасканальваюцца і становяцца ўсё больш папулярныя. Не палохаюць удзельнікаў нават умовы надвор'я: калі хмары захінулі неба — Алімпіядзе ўсё роўна быць. Часам увогуле здараюцца цуды — на зямлю не ўпадзе аніводная кропелька дажджу, пакуль не скончацца спаборніцтвы.

На Алімпіядзе — шырокі выбар спартыўных гульняў. Самыя папулярныя з іх — бег, стральба, боўлінг, дартс. Віды спаборніцтваў выбіраюцца, канешне ж, па даступнасці. У Грабёнцы няма вялікага стадыёна ці басейна... Дзмітрый Жураўлёў разам з неабыякавымі бацькамі і іх дзецьмі штогод абмяркоўвае летнюю праграму Алімпіяды. У сацыяльнай сетцы «УКантакце» створана суполка, у якой удзельнікі могуць выказаць сваё меркаванне і прапанаваць штосьці новае.

Дзмітрый штогод прывозіць з Масквы відэакамеры, на якія запісвае ўсе спартыўныя гульні. Пасля робіць відэафільм для тамтэйшага кабельнага тэлебачання. Відэа можна паглядзець і на YouTube. Вядучыя і аператары — самі ўдзельнікі ці тыя, хто ўжо пераадолеў узроставую мяжу. Такой справай дзеці захапляюцца не менш, чым самімі гульнямі, а можа нават развіваюць схаваны журналісцкі талент. Між іншым, відэафільмы атрымалі водгук у Маскве. Дзмітрый расказвае: «Многія людзі, асабліва пенсійнага ўзросту, ладзяць падобныя спаборніцтвы ў сваіх дварах. Канешне, меншага маштабу, з меншай колькасцю ўдзельнікаў... Гэта сведчыць аб тым, што наша Алімпіяда стала для іх стымулам праводзіць сваю».

Нават у век панавання лічбавага тэлебачання і інтэрнэту алімпійская ідэя жыве не толькі ў сусветным маштабе. І для таго, каб адчуць сябе чэмпіёнам, не абавязкова мець прафесійную падрыхтоўку. Галоўнае — жаданне і імкненне арганізоўваць, удзельнічаць, перамагаць.

**Юлія АДАМОВІЧ,**
**студэнтка ІІ курса**
**Інстытута журналістыкі БДУ.**

*Не вучобай адзінай*

## Канікулы скончыліся, а работа — не

**30 студэнцкіх камандаў БДУ працавалі гэтым летам у сэрвісных, педагагічных, сельскагаспадарчых і экалагічных студатрадах на аб'ектах БДУ, сталіцы і нашай краіны.**



Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

Упершыню сёлета на базе Фундаментальнай бібліятэкі БДУ былі сфарміраваны студэнцкія сэрвісная атрады. Хлопцы і дзяўчаты выконвалі розныя заданні ў сектары інфармацыйных тэхналогій бібліятэкі, шукалі і рабілі спасылкі на публікацыі навукоўцаў і выкладчыкаў БДУ на адпаведных іх тэматыцы інтэрнэт-сайтах, стваралі персанальныя вэб-старонкі для прафесарска-выкладчыцкага складу ўніверсітэта і акадэмікаў на сайтах «Вікіпедыя.by» і «Вікіпедыя.ru».

Больш за 300 чалавек былі задзейнічаны ў Смалявіцкім лясгасе, гатэлі «Рэнесанс», у сетцы супермаркетаў «Віталюр», спартыўным аздараўленчым лагеры «Гарызонт», агракамбінаце «Ждановічы».

Таксама студэнты БДУ актыўна прымалі ўдзел у добраўпарадкаванні тэрыторыі на базе спартыўна-аздараўленчага комплексу «Брыганціна», працавалі там важатымі і культурологамі. Акрамя таго, прадпрыемства БДУ «Шчомыслiца» сёлета прыняло 40 студэнтаў у складзе сельскагаспадарчых атрадаў, якія займаліся прапалкой сельгаскультур.

Зараз студэнцкія атрады БДУ збіраюць ураджай яблыкаў у агракамбінаце «Ждановічы», а з 14 верасня да работы прыступіць студэнцкі атрад «Папараць-кветка» імя рэктара БДУ, Героя Сацыялістычнай Працы А. М. Сеўчанкі. Студэнты будуць шчыраваць у вядучай нацыянальнай кампаніі электрасувязі «Белтэлекам» у якасці інтэрв'юераў.

**Надзея НІКАЛАЕВА.** *nikalaeva@zviazda.by*

*Мары — збываюцца!*

# ЯК СТАЦЬ ЛЕПШЫМ ДЫДЖЭЕМ?

**Сяргей Сямашка, ён жа Dj Airo Amis, заняў першае месца ў Рэспубліканскім конкурсе «Бітва дыджэяў «Беларусь і я», які праходзіў падчас Дня моладзі ў рамках XXVI Міжнароднага фестывалю мастацтваў «Славянскі базар у Віцебску».**



**Пераможца рэспубліканскага конкурсу «Бітва дыджэяў «Беларусь і я» Сяргей Сямашка — Dj Airo Amis.**

Тады на адкрытай пляцоўцы на плошчы Перамогі вясялілася, «запальвала», перамагала ў розных конкурсах, словам, вяла рэй моладзь з усёй краіны. Арт-парад маладзёжных субкультур, дыска-фолк «Вышыванка.by», традыцыйная патрыятычная акцыя «Мы памятаем і ганарымся», песні, танцы — шматлікія мерапрыемствы былі аб'яднаны агульнай тэматыкай «Беларусь — крыніца натхнення». Кульмінацыяй же стала грандыёзная маладзёжная вечарына — творчы конкурс дыджэяў, якая сабрала пераможцаў рэгіянальных тураў. Акунуцца ў музычна-танцавальную атмасферу гасцям фестывалю дапамаглі лепшыя дыджэі краіны. А Мінскую вобласць прадставіў добра вядомы Dj Airo Amis — Сяргей Сямашка з Беразіна.

— Упершыню паўдзельнічаў у конкурсе дыджэяў у 2013 годзе. Тады і паставіў перад сабой мэту — абавязкова вярнуцца з запаветным першым месцам. Удасканальваў навыкі, прыдумваў новыя гукі, спалучаў з імі музычныя кампазіцыі — не здраджваў захапленню і ішоў да гэтай перамогі пяць гадоў. Калі пачуў, што менавіта мяне прызналі лепшым дыджэем, — эмоцыі перапоўнілі! Бязмерная радасць, шчасце, усмешкі. Ура! Я гэта зрабіў, — прыгадвае мой суразмоўнік.

Дарэчы, спецыяльнай музычнай адукацыі хлопец не мае, але, як ён прызнаецца, у яго душы заўсёды жыве музыка. Пасля заканчэння Бярэзінскай гімназіі атрымаў прафесію інжынера ў Беларускім дзяржаўным аграрнатэхнічным універсітэце і нават два гады шчыраваў па спецыяльнасці ў адкрытым акцыянерным таварыстве «Першамайскі». Цяпер жа ён працуе інжынерам Бярэзінскай спартыўнай дзіцяча-юнацкай школы алімпійскага рэзерву. Ды, пагадзіцеся, спецыяльная падрыхтоўка для творчасці не заўсёды патрабуецца. Сяргей сам, эксперыментуючы, навучыўся тэхнічным прыёмам і тонкасцям, патрэбным сучаснаму дыджэю, разабраўся ў розных музычных кірунках і стылях.

— Пацвярджэннем таго, што Сяргей сапраўды творчы чалавек, стала рэакцыя публікі на «Славянскім базары». Калі музыку «круціў» Сяргей, панаваў ашаламляльны настрой і ўсіх перапаўнялі яркія эмоцыі. Адчувалася, што хлопец умее працаваць і з гукам, і з публікай. Але іншыя дыджэі таксама ўскалыхнулі, завялі, расварушылі прысутных. Безумоўна, складана было выбраць найлепшага з найлепшых.

— Цікава, на што ў першую чаргу члены журы звяртаюць увагу ў такіх конкурсах? — запытала я ў Сяргея.

## Верыць у перамогу і настойліва ісці да яе

— На якасць звядзення трэкаў і іх колькасць за невялікі прамежак часу, уменне працаваць з публікай, падбор матэрыялаў... Каб усё гэта выканаць, вядома ж, неабходна справіцца з хваляваннем. Але, шчыра прызнаюся, у мяне яно прысутнічала, пакуль не абвясцілі вынікі.

— А як зразумець, ці падабаецца твая музыка?

— Гэта адразу бачна па руках людзей — актыўна танцуюць альбо «вяленька». Калі да гадзіны ночы з пляцоўкі нікто не сыходзіць, а, наадварот, прысутных прыбывае з кожным трэкам, і калі пад раніцу ўва ўсіх баляць ногі, а, прыйшоўшы дадому, яны ўспамінаюць, як класна патанцавалі напярэдадні, — значыць, у мяне ўсё атрымалася.

Падтрымаць Сяргея, «пахварэць» за яго і паўдзельнічаць у Дні моладзі на «Славянскім базары» прыехалі юнакі і дзяўчаты Бярэзіншчыны. Такое невялікае падарожжа для іх арганізаваў Бярэзінскі райкам БРСМ.

— Дні моладзі — гэта добрая нагода пазнаёміца маладым людзям з усёй краіны, паказаць свой талент, навучыцца чамусьці новаму і цікаваму, — зазначыла выконваючая абавязкі першага сакратара Алеся Гурынава. — Безумоўна, вельмі хваляваліся за Сяргея. Рада, што ён заняў заслужанае першае месца. Жадаем яму новых значных перамог!

**Юлія БУКЕЛЬ.**



Самыя прыгожыя

# «ХАЧУ БЫЦЬ ПРЫКЛАДАМ ДЛЯ ІНШЫХ»

## Мінчанка стала фіналісткай конкурсу «Міс свету на інвалідная калясцы»

**Пра конкурсы прыгажосці Саша ніколі не марыла. А тут раптам вырашыла паспрабаваць. Падала заяўку... і трапіла ў фінал. Праз месяц 23-гадовая мінчанка Аляксандра ЧЫЧЫКАВА будзе прадстаўляць нашу краіну на «Міс свету на інвалідная калясцы».**

На інтэрв'ю мы сустракаемся ў адным з гандлёвых цэнтраў. Зграбная, абаяльная, са шчырай усмешкай, Аляксандра не адчувае скаванасці, хоць некаторыя і паглядаюць з цікаўнасцю на яе каляску. Месца сустрэчы дзяўчына прапанавала сама. Прызнаецца: сядзець дома ў чатырох сценах — гэта не для яе. Саша часта гуляе па горадзе, бывае ў кавярнях і барах. У замежныя падарожжы таксама ездзіць: нядаўна, напрыклад, паўтара месяца была ў Амерыцы.

Дзяўчына працуе ў гіпермаркеце паслуг 124 — гэта кол-цэнтр, дзе ствараюць працоўныя месцы для людзей з інваліднасцю. Там яна займае пасаду вядучага спецыяліста па рабоце з кліентамі: падтрымлівае сувязь з заказчыкамі, навучае новых работнікаў.

Паралельна Аляксандра вучыцца ў Беларускім дзяржаўным педагагічным універсітэце імя Максіма Танка.

— Хацела паступіць на лагапеда, але медыка-экспертная камісія сказала, што мне нельга ісці ў гэтую прафесію. Таму выбрала спецыяльнасць псіхолага — сацыяльнага педагога. На сёння мне бліжэй сацыяльная работа. Хачу потым звязаць сваё жыццё з гэтым кірункам, працаваць з людзьмі, якія таксама атрымалі інваліднасць, дапамагаць ім спраўляцца з цяжкасцямі.

Траўма, праз якую Саша апынулася ў інвалідным крэсле, здарылася шэсць гадоў таму.

— Я ўпала з трэцяга паверха дома. Ішла будоўля, я зачапілася за крук, які быў у пліце, — успамінае дзяўчына. — Тое, што больш не буду хадзіць, успрыняла спакойна, адэкватна. У мяне не было дэпрэсіі і непрыняцця сябе. Сям'я вельмі падтрымала. Яны далі зразумець: нічога страшнага не здарылася... Каляска не з'яўляецца прысудам. Некаторыя кажуць: прыкаваная да інваліднага крэсла. Не! Не люблю гэта слова — «прыкаваная». Каляска — гэта сродак руху, які мне ў дапамогу. Я лічу, няправільна ставіцца да нейкіх адрозненняў чалавека, як да дэфектаў.

Пра міжнародны конкурс прыгажосці мінчанка даведалася праз Фэйсбук. Праводзіць яго фонд, які заснавалі дзве жанчыны (мамы-інваліды), для таго каб змяніць вобраз дзяўчат, якія перасоўваюцца на інвалідная калясцы. Раней конкурс ладзілі сярод жыхарак Польшчы, а сёлета выйшлі на міжнародны маштаб.

Фінал конкурсу адбудзецца 7 кастрычніка ў Варшаве. За карону будуць змагацца 24 прыгажуні. Аляксандра адправіцца ў Польшчу раней, каб падрыхтавацца да выступлення. Прызнаецца, што пакуль не ведае, якія дэфіле і нумары яе чакаюць. Таму сукенкі для сцэны яшчэ не падабрала. Арганізатары напісалі толькі пра абутак: трэба мець дзве пары туфеляў элегантнага віду, адну — абавязкова чорную. І папярэдзілі, што заўсёды важна будзе выглядаць вельмі добра, бо на семінарах могуць прысутнічаць фатографы і журналісты. «Трэба перабраць свой гардэроб», — смяецца Саша.

Цікаўлюся, як ёй удаецца трымаць сябе ў такой добрай форме. Дзяўчына кажа, што не прытрымліваецца ніякіх дыет. Але сочыць за сваім харчаваннем, напрыклад, не есць шмат тлустага. Плюс наведвае трэнажорную залу: акрамя звычайных практыкаванняў на рукі і прэс займаецца з інструктарам лячэбнай фізкультурай.

— І як рэагуюць іншыя наведвальнікі, калі бачаць цябе?

— Я там даўно займаюся, таму мяне ўжо ведаюць. Тыя, хто прыходзіць упершыню, часам косяцца: маўляў, што яна тут робіць? Але мяне гэта не чапляе. Калі ласка, глядзіце, якая я прыгожая і худая *(усміхаецца)!*

Аляксандра не хавае: на «Міс свету» хоча перамагчы. Але для яе важная не толькі карона каралевы прыгажосці. «Што мяне прываблівае ў гэтым конкурсе? Ты выходзіш не проста пакрасавацца. Шмат дзяўчат на калясцы ўпадаюць у дэпрэсію і думаюць, што ніколі не будуць мець сям'ю, што ніводзін хлопец на іх не зверне ўвагу. Я змагу стаць прыкладам і паказаць, што жыццё з-за інваліднасці не заканчваецца».

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.**
*lubneuskaya@zviazda.by*

# ПРЫЦЯЖЭННЕ КЕРНУ...

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)*

— Часам мы аперыруем такімі данымі, якія цяжка ўявіць простаму чалавеку, — кажа ён. — Напрыклад, тут можна пабачыць горныя пароды, абсалютны ўзрост якіх складае больш за 600 мільёнаў гадоў (для параўнання, першыя dынназаўры з'явіліся ў трыясавым перыядзе, гэта значыць 230 мільёнаў гадоў таму). Керн, які мы трымаем у руках, нясе ў сабе вельмі шмат інфармацыі, ён адлюстроўвае сукупнасць працэсаў, што працякалі ў далёкія часы геалагічнай мінуўшчыны. У тым і цікавасць, таямніца геалогіі: даведацца, што адбывалася раней, у якой паслядоўнасці і якім чынам гэтыя падзеі паўплывалі на сучаснасць. Калі мы ведаем гісторыю геалагічнага развіцця тэрыторыі, то можам прыкладна меркаваць, назапашанне якіх карысных выкапняў магло адбывацца ў яе межах.

Паводле слоў Сяргея, непасрэдна ў бурэнні свідравін геолагі яго профілю звычайна не прымаюць удзелу — на тое ёсць буравая брыгада і палявы геолаг, які афармляе першасную геалагічную дакументацыю. У Слуцку знаходзіцца кернасховішча, сюды звозяць на пастаяннае захоўванне доследны матэрыял са свідравін з розных куткоў нашай краіны. Гэта рэчыўная «база даных» айчынных геолагаў.

## ЗА ЧАСАМ НЕ СОЧАЦЬ

— У мяне з дзяцінства было шмат інтарэсаў, цікавіўся ўсім, што звязана з навакольным светам, — кажа хлопец. — Усе дысцыпліны даваліся аднолькава добра, з гэтай прычыны было складана зрабіць выбар на карысць адной. У рэшце рэшт, пасля заканчэння навагрудскай гімназіі №1 я паступіў на геаграфічны факультэт БДУ. У тыя гады там быў даволі вялікі конкурс, спецыяльнасць была самай запатрабаванай на факультэце. Так я і трапіў у геалогію, якая з'яўляецца сінтэзам розных дысцыплін. Тут сутыкаюцца прыродазнаўчыя фізіка і хімія. Геалогія абавязкова карыстаецца матэматычным апаратам. У той жа час гэта навука і апісальная, творчая, ёсць у ёй элемент суб'ектывізму. Яшчэ на чацвёртым курсе ўніверсітэта прыйшоў на работу ў аддзел геалогіі і мінерагеніі платформеннага чахла, так і застаўся тут.

Тэрыторыя Беларусі ў геалагічным сэнсе закрытая: пароды крышталічнага фундамента перакрыты велізарнай тоўшчай асадкавых адкладаў (напрыклад, у Прыпяцкім прагіне ёсць участкі, дзе яны дасягаюць 6,2 кіламетра). А менавіта крышталічны фундамент звычайна багаты на разнастайныя карысныя выкапні.

— Самая глыбокая свідравіна, прабураная ў Беларусі, дасягае 6 кіламетраў. Асабіста я трымаў у руках граніты з глыбіні больш як 5,5 кіламетра, — гаворыць Сяргей.

Часам палявая праца з кернам ідзе даволі хутка, а бывае, трэба сядзець над кожным сантыметрам горнай пароды. Да таго ж свідравіну яшчэ працягваюць бурыць — сюды падвозяць усё новы і новы матэрыял. Вядома, за гадзіннікам тут ніхто не сочыць — працуюць столькі, колькі патрабуецца. Пасля вяртання ў Мінск справа працягнецца ўжо ў сценах інстытута.

## ШЧЫРАВАЦЬ — У ПОЛЕ

...Пробы керну ўжо ў сталіцы. У адной з лабараторый на вялікім стале раскладзены дзясяткі невялікіх скрынак з дробнымі порцыямі пароды і подпісамі: назвай свідравін, глыбінёй і іншымі параметрамі. З узорамі працуе **інжынер аддзела геалогіі і мінерагеніі платформеннага чахла Таццяна МІНЯНКОВА.** У геалогі дзяўчына трапіла дзякуючы любові да геаграфіі. Яшчэ калі вучылася ў родным Барысаве, удзельнічала ў рэспубліканскіх алімпіядах па гэтым прадмеце, займала прызавыя месцы. Атрымліваць адукацыю вырашыла на геаграфічным факультэце БДУ. Геалагічны кірунак выбрала, бо не бачыла сябе ў «кабінетнай» рабоце, а гэта прафесія ўяўлялася ёй самай «палявой».

— Магу ўпэўнена сказаць, што не прагадала, — сцвярджае дзяўчына. — Вучыцца было вельмі весела і цікава. У нас падабралася вельмі моцная група, мы пасябравалі, у тым ліку і з замежнікамі: туркменамі і нігерыйцамі. Штогод ездзілі практыкавацца «ў поле», я і хацела. Прычым заўсёды можна было выбраць, што табе больш даспадобы: калі баішся спёкі — займайся камеральнай апрацоўкай, хочаш — працуй пад адкрытым небам. Самае цікавае, што ў нас якраз дзяўчаты часцей выбіралі апошняе, а хлопцы шчыравалі ў лабараторыях.

У Інстытут геалогіі Таццяна трапіла паўгода таму. Але для гэтага давялося змяніць профіль, бо першапачаткова дзяўчына спецыялізавалася на інжынернай геалогіі — вывучэнні грунтоў перад будаўніцтвам. Цяпер яна вучыцца ў магістратуры БДУ, а ў Інстытуце геалогіі працуе на палову стаўкі.

— Адразу, як прыйшла сюды, мяне спыталі, ці гатовая я да камандзіровак, — успамінае даследчыца. — Вядома, адказала, што так. І мяне адразу ж адправілі ў Слуцк. Але ўсе складанасці я перанесла лёгка. Працаваць да дзевяці вечара? Не праблема. Сядзець цэлы дзень пад пякучым сонцам? Калі ласка! Цяпер, праўда, прапусціла некалькі выездаў, бо наведвала курсы. У асноўным сканцэнтравалася на працы ў лабараторыі — тут патрабаваўся чалавек, які будзе займацца менавіта мінералагічным аналізам, вось мяне і паклікалі. Вучуся ў асноўным у старэйшых калег, спрабую паўтараць тое, што яны робяць, часам звяртаюся па параду.

## БЕЗ ХІМІІ НІЯК

У абавязкі дзяўчыны ў першую чаргу ўваходзіць аналіз проб, прывезеных з палявых работ. Спачатку трэба раздрабніць пароду, а гэта далёка не заўсёды проста. Дзесьці керн паддаецца механічнай апрацоўцы лёгка, а недзе за мільёны гадоў ён ператварыўся ў сапраўдны камень. У апошнім выпадку на дапамогу клічуць... хлопцаў. Далей, выкарыстоўваючы спецыяльныя сіты, матэрыял раздзяляюць на фракцыі паводле памеру, і пачынаецца карпатлівая праца — пад мікраскопам ці бінакулярам геолагі адну за адной аддзяляюць і сартуюць кожную пясчынку, пасля вылічваюць сумарны аб'ём кожнага віду пароды.

— Вядома, нямала даводзіцца «хімічыць», — усміхаецца Таццяна. — Геолагу без кіслаты — нікуды. Напрыклад, мы сумняваемся, ці ёсць у пародзе кальцыт, — дадаём саляную кіслату і калі бачым актыўнае выдзяленне газаў, то пацвярджаем сваю тэорыю. Бывае, што шукаем мінералы, якія характарызуюцца магнітнай успрымальнасцю, — для гэтай працы ў нас ёсць спецыяльны прыбор.

Дзяўчына дэманструе нам уласныя здымкі акамянеласцяў аманітаў — вымерлых галаваногіх малюскаў. Нярэдка ў геалагічным матэрыяле сустракаюцца адбіткі старажытных рыб, раслін, таму геолаг — гэта яшчэ трохі і палеантолаг. Трымаць у руках сляды істот, якія насялялі тэрыторыю Беларусі 200 мільёнаў гадоў таму, па словах дзяўчыны, — незабыўнае адчуванне. Знойдзеныя акамянеласці звычайна перадаюць іншым спецыялістам — ім яны могуць шмат пра што расказаць, напрыклад, дапамагаюць вызначыць прыблізны ўзрост пароды паводле яе «насельнікаў».



**Мікраскоп — адзін з галоўных працоўных інструментаў геолага ў лабараторыі.**



**Малаток, лупа і графікі каратажу — геафізічнага даследавання свідравін.**

**Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ.**
*lyskavets@zviazda.by*
*Мінск—Слуцк—Мінск.*
**Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.**

*У кожным з нас*

# «МЫ І ЁСЦЬ НАША МОВА»

**У Нацыянальным цэнтры сучасных мастацтваў давялося пабываць на спектаклі «Мова X» эксперыментальнага тэатра «Галава-нага». Пастаноўка, прысвечаная моўнай сітуацыі ў Беларусі, атрымала спецыяльны прыз у намінацыі «Найлепшая эксперыментальная работа» на міжнародным фестывалі «Тэатральны Куфар — 2016».**

Спектакль быў створаны паводле вершаў сучаснай беларускай паэткі Вальжыны Морт пад назвамі «Беларуская мова I» і «Беларуская мова II». Рэжысёр пастаноўкі Аляксей Стрэльнікаў — выкладчык беларускай літаратуры ў Інстытуце журналістыкі БДУ. Аднойчы студэнты прынеслі яму вышэйназваныя вершы і сказалі: «Вось гэта пра нас». Сапраўды, тэма, якую ўздымае Вальжына Морт, можа паказацца блізкай многім маладым беларусам: як адрадзіць традыцыі і пачаць размаўляць на роднай мове, не звяртаючы ўвагі на грамадскія стэрэатыпы? У Аляксея ўзнікла ідэя прысвяціць гэтым пытанням сваю пастаноўку.

Галоўная адметнасць спектакля — інтэрактыўнасць. У дзеянні прымаюць удзел не толькі акцёры, але і самі гледачы. Дарэчы, іграюць на сцэне ўсяго толькі чатыры дзяўчыны — Хрысціна Грэкава, Кацярына Карпіцкая, Кацярына Чэкатоўская і Паліна Адашкевіч (першыя дзве артысткі — выпускніцы Інстытута журналістыкі, трэцяя скончыла факультэт псіхалогіі БДПУ, чацвёртая — студэнтка Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў). Таму спектакль «лакальны» — разлічаны на невялікую колькасць людзей, доўжыцца ён каля дваццаці хвілін.

...Цішыня. У запісе гучыць пачатак твора Вальжыны Морт. Акцёры, раз за разам паўтараючы радкі верша, выбіраюць сярод гледачоў чатырох, якіх уводзяць у тэатральнае кола. Верш працягваецца, кожная страфа прадстаўляе пэўнае дзеянне: акцёры імітуюць нараджэнне мовы, пралазячы паміж ног гледачоў, разам з імі калыхаюць кволае «дзіця»... Праз рухі, жэсты, інтанацыю перадаюць ідэю верша, але ў выніку для кожнага яна свая...

Пасля заканчэння спектакля адбылося яго абмеркаванне. Усе прызналіся, што задавалі сабе шмат пытанняў, галоўнае з якіх: чаму я не размаўляю на беларускай мове? Асабліва моцныя ўражанні засталіся ў гледачоў-удзельнікаў: такі блізкі кантакт з акцёрамі спачатку выклікаў разгубленасць. Незразумелым было, як паводзіць сябе далей — усміхацца або быць сур'ёзным, штосьці зрабіць у адказ або працягваць сядзець на месцы. «Калі акцёры гаварылі шэптам, было няёмка, бо здавалася, што са мной дзеляцца чымсьці вельмі асабістым», — расказала адна з глядачак.

Сапраўды, важную ролю ў пастаноўцы адыгрывае інтанацыя акцёраў. Калі яны, наадварот, пачынаюць гаварыць гучна, амаль пераходзяць на крык, то кожнае іх слова быццам рэхам аддаецца ў душы. У гэты момант ад акцёраў ідзе настолькі моцны зарад энергіі, што ад лішку эмоцый нават выступаюць слёзы на вачах.

Хрысціна Грэкава, адна з дзяўчат-акцёраў, прызналася: «Было вельмі прыемна бачыць рэакцыю залы. Гэта неймаверна, калі не толькі акцёр дзеліцца з людзьмі эмоцыямі, але і яны паказваюць табе сваё».

Дарэчы, акрамя чатырох крэслаў і пражэктара, ніякіх дэкарацый у спектаклі не было. Амаль адсутнічаў і рэквізіт: для ўвабаснення ідэі акцёрам хапіла некалькіх кавалкаў ільнянай тканіны і чорных хустак. Пры мінімуме дэталяў ствараўся максімум сэнсу. Гэта той спектакль, дзе галоўную ролю іграеш ты сам, дзеянне адбываецца не на сцэне, а ў тваёй галаве. Акцёры толькі дапамагаюць табе ўключыць фантазію.

Менавіта такія пастаноўкі выклікаюць шмат новых думак, над якімі варта паразважаць. Вальжына Морт пісала: «Мы і ёсць наша мова». Спектакль дае магчымасць літаральна адчуць праўдзівасць слоў паэткі. Аднак быць альбо не быць, кожны вырашае для сябе сам.

**Ганна ЯЎСЕЙЧЫК, студэнтка II курса Інстытута журналістыкі БДУ.**

*Модны павеў*

# ЗГУРТАВАНЫЯ АГУЛЬНАЙ ПРАСТОРАЙ,

## ці Што такое каворкінг

**...Размаляваныя сцэны і крэслы-мяшкі аранжавага колеру нагадваюць зону адпачынку. Сталы з настольнымі лямпамі і дошка для запісаў крэйдай наводзяць на думку пра вучэбную аўдыторыю. Насамрэч гэта ні першае, ні другое, а месца, дзе шукаюць аднадумцаў, абменьваюцца ідэямі і распрацоўваюць планы. Гаворка ідзе пра такую новую з'яву, як каворкінг — калектыўны офіс.**



Замежныя бібліятэкары ўлічылі схільнасць моладзі рабіць некалькі спраў аднachасова і адмовіліся ад стэрэатыпу захавання цішыні падчас працы з кнігай. У выніку прастора для чытання стала раздзяляцца на колерныя зоны. У зялёнай можна гучна гаварыць, у жоўтай гэта дазваляецца са згоды суседа, у чырвонай шумець забараняецца. Ведаючы такі прынцып, работнікі Навуковай бібліятэкі БНТУ пайшлі яшчэ далей і стварылі месца, дзе дазволена слухаць музыку, піць каву і, вядома, абмяркоўваць усё важнае і цікавае.

— Калі студэнты хацелі дапісаць разам праект ці пачаць «мазгавы штурм», гэта часам ператваралася ў праблему, — кажа **галоўны бібліятэкар аддзела маркетынгу і праектнай дзейнасці Вольга ВОЎК.** — Маладыя людзі ішлі на розныя прыдумкі: займалі актавую залу, ссоўвалі сталы ў сталоўцы... Але зразумела, што гэтыя месцы былі мала прыстасаваныя для разумовай ці творчай працы.

Па задумцы памяшканне падзяляецца на тры зоны, у якіх з камфортам аднachасова могуць размясціцца 130 чалавек. У зоне А ёсць праектар, мікрафон, трыбуна, музычныя калонкі — усё, што можа спатрэбіцца для лекцыі ці прэзентацыі. Падтрымліваюцца таксама ідэі кінапаказаў, правядзення майстар-класаў, трэнінгаў... Словам, усяго, што будзе цікавым аўдыторыі ў некалькі дзясяткаў чалавек. Зона Б абсталяваная сталамі для індывідуальнай работы, лямпамі і разеткамі. Тут можна падрыхтавацца з ноўтбукам да лекцый ці проста прабавіць час у мяккім крэсле-мяшку. Зона С падыдзе для «мазгавога штурму». Гэтаму спрыяюць чатыры вялікія сталы, што лёгка ссоўваюцца разам, дошка для запісаў крэйдай і магчымасць прынесці з сабою кубачак кавы.

Увасобіць ідэю на чарцяжы напачатку згадзілася дзяўчына з Масквы, потым, калі ўмовы не дазволілі працягваць працу, за праект узялася аспірантка БНТУ Вольга Шамшура. Дзяўчына за два тыдні закончыла план і запрасіла мастачку з псеўданімам Ан Самалёт, якая ўпрыгожыла сцены будучага калектыўнага офіса малюнкамі. Узоры, зробленыя акрылавымі маркерамі, не проста аздабленне, яны абазначаюць месца для экрана праектара, падкрэсліваюць раздзяленне залы на тры зоны. Дарэчы, калі ўважліва разглядаць адлюстраванні, у іх відаць спасылкі на іншыя праекты бібліятэкі: конкурс «Горад і кнігі», клуб настольных гульняў...

— У адзін з апошніх дзён, калі практычна ўсё было скончана, прыйшла Вольга Шамшура, сказала, што горад на сценах прыгожы, толькі выглядае пустым, і дамалявала яго: дзесьці коціка, недзе птушачку ці вазон на акне. Але для поўнага завяршэння патрабаваліся сродкі на новую мэблю і абсталяванне, — успамінае першыя этапы рэалізацыі Вольга Воўк.

Пасля двух гадоў няпэўнага становішча ў праекта з'явіліся спонсары. Кампанія, рэзідэнт Парка высокіх тэхналогій, ужо да гэтага некаторы час супрацоўнічала з БНТУ. Арганізатары паказалі яе прадстаўнікам прэзентацыю і атрымалі сродкі, каб купіць абсталяванне. Цяпер ёсць задума стварыць тут яшчэ і добраахвотную творчую лабараторыю студэнтаў. Мяркуецца, што там будзе распрацоўвацца праграмнае забеспячэнне для ўніверсітэта пад кіраўніцтвам спецыялістаў кампаніі-спонсара.

Нягледзячы на сваё размяшчэнне на бібліятэчнай плошчы, папяровых кніг у калектыўным офісе няма. Затое ёсць бясплатны доступ да баз даных навуковай бібліятэкі БНТУ. Таксама побач знаходзяцца спецыялісты, якія растлумачаць прынцып карыстання.

— Моладзі цікава займацца самымі рознымі праектамі і стартапамі, для іх звесткі па выбранай тэме становяцца падмуркам працы. Такую паслугу немагчыма атрымаць у іншых аналагічных гарадскіх праектах, бо там за дадатковую плату максімум, на што можна разлічваць, — гэта на падборку перыёдыкі па заяўленай тэме. Бібліятэка купляе якасныя базы даных, мае архіў навуковых часопісаў у 20 тысяч найменняў, дзе можна хутка знайсці патрэбныя артыкулы. Прычым паслуга гэта бясплатная для карыстальніка, — расказвае галоўны бібліятэкар.

У першы дзень ад карыстальнікаў залы, якія не з'яўляецца студэнтам БНТУ, запатрабуецца сімвалічная плата ў 1,2 рубля для афармлення білета чытача, за наступныя наведванні нічога плаціць не трэба. Наогул, наведвальнікаў з БНТУ і не толькі праект прываблівае. Ужо ёсць першыя заявы на лекцыйныя і сумесныя пляцоўкі, а самай запатрабаванай пакуль застаецца зона індывідуальнай працы. Арганізатары спадзяюцца, што праз нейкі час іх праект пачне канкурыраваць за наведвальнікаў з іншымі гарадскімі. У першую чаргу гэтая зала бібліятэкі стане прывабнай для аўдыторыі, у якой не так многа грошай, каб здымаць пастаянныя офісныя памяшканні: маладых стартапаў, дабрачынных, валанцёрскіх праектаў, дабраахвотных майстар-класаў.

Вольга Воўк, заўважае, што ў іншых гарадах краіны таксама з'яўляюцца «зялёныя зоны» для карыстальнікаў, якім нецікава быць у цішыні. Напрыклад, як каворкінг-цэнтр заяўлены адзін з пакояў цэнтральнай бібліятэкі імя К. Маркса ў Магілёве. Аднак супрацоўніцтва паміж «гучнымі» чытальнымі заламі пакуль застаецца ідэяй на будучыню...

**Рагнеда ЮРГЕЛЬ.**

*yurgel@zviazda.by*

*Камертон настрою*

# Радком вершаванай матэрыі...

**Часта даводзіцца чуць, што людзі з тэхнічным складам розуму менш здольныя да творчасці або зусім не здольныя. Гэта стэрэатып. Таццяна КУПРЫЯНЕЦ — адна з тых, хто якраз абвяргае гэта. Дзяўчына скончыла фізічны факультэт БДУ і цяпер працуе па спецыяльнасці. А яшчэ яна з'яўляецца членам Саюза пісьменнікаў Беларусі.**

***— Чаму ты выбрала менавіта фізіку?***

— Яшчэ са школы я адчувала схільнасць да дакладных навук. Фізіка падабалася больш за іншыя дысцыпліны. Таму пры выбары пры паступленні я аддала перавагу фізічнаму факультэту БДУ. Цяпер працую ў Мінскім навукова-даследчым інстытуце радыёматэрыялаў. Мяне як маладога спецыяліста калектыў прыняў добра. Я суправаджаю партыі па тэхналагічным маршруце. Калі больш зразумела — то працую з мікрасхемамі. Мне падабаецца мая работа.

***— А як пачала пісаць вершы?***

— Пад уражаннем ад кніг, музыкі, прыроды. Прыходзілі радкі, якія хацелася запісаць. І я запісвала. А потым хацелася працягнуць напісанае — так і нараджаліся першыя творы. Праўду кажучы, тады я не лічыла іх сапраўднымі вершамі, ды і цяпер многія не лічу. А сваздома займацца творчасцю я пачала ў 20 гадоў пасля таго, як стала лаўрэатам літаратурнага конкурсу сярод студэнтаў БДУ «Славянскі калейдаскоп». Тады і зразумела, што гэта маё, што нядрэнна выходзіць.

***— Ты пішаш на розныя тэмы або аддаеш перавагу нейкай адной?***

— Усё залежыць ад натхнення. Але ўсё ж перавагу ваенная тэматыка. Тэма вайны заўсёды вельмі моцна кранала мяне. Я цікаўлюся ёй з дзяцінства. У мяне дзядуля ваяваў, дайшоў да Берліна. І тыя людзі, якія былі на вайне, нам не чужыя, бо мы дзякуючы ім жывём. У мяне заўсёды ўзнікалі пытанні: як было тым людзям на вайне? Як яны вытрымалі і перамаглі? Што яны адчувалі? Простымі словамі ў мяне не атрымліваецца ўсё гэта перадаць, тады нараджаюцца вершы. А яны больш моцныя за адзіночныя словы.

***— Кажуць, што ў кожнага паэта ёсць свая муза. А што цябе натхняе?***

— Калі я пішу пра вайну, то мяне натхняюць месцы і падзеі, звязаныя з тымі часамі. Бывае, што проста пейзажы натхняюць. Ну, і вядома, каханне.

***— Аднойчы мне давялося пачуць выказванне, маўляў, як маладое пакаленне можа пісаць пра вайну, калі яно нічога аб гэтым не ведае...***

— Я лічу так: калі адчуваеш і калі пішацца, то трэба пісаць. Калі чагосьці не ведаеш, то трэба даведвацца. Крыніц інфармацыі цяпер шмат. А з іншага боку, чаму аўтар тых слоў вырашыў, што маладое пакаленне нічога не ведае пра вайну? Не трэба абагульняць.



***— Таццяна, чым яшчэ захапляешся?***

— Акрамя паэзіі і фізікі цікаўлюся ваеннай справай, асабліва авіяцыяй. Нядаўна пачала займацца авіямадэляваннем. Вельмі люблю выязджаць куды-небудзь на прыроду, калі ёсць час і магчымасць. Таксама з'яўляюся адміністратарам універсітэцкага клуба мастацкага слова «КЛУмБа». Аб'яднанне было створана ў 2014 годзе пасля «Славянскага калейдаскопа» ўдзельнікамі таго мерапрыемства. Мы арганізоўваем для студэнтаў і гасцей БДУ цёплыя цікавыя паэтычныя сустрэчы, віктарыны, выступленні, запрашаем да сябе вядомых беларускіх літаратараў, а бывае, проста збіраемся, каб правесці час за кубачкам гарбаты. У 2015-м мы ездзілі ў музей Агінскага пад Смаргонню, прайшлі па месцах баёў Першай сусветнай. А ў верасні мінулага года ў нас з'явіўся першы калектыўны зборнік «Кветкавыя вятразі». Мы заўсёды рады новым аўтарам і гасцям нашага аб'яднання.

**Марына ЛЯШКЕВІЧ.**

**ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» (организатор аукциона) по поручению СООО «Охотник», в лице ликвидатора Жданович Л. В. (продавец) извещает о проведении 15 сентября 2017 года открытого повторного аукциона со снижением начальной цены на 50% после вторых несостоявшихся торгов по продаже имущества в 11.00 в г. Гомеле по ул. Гагарина, 20**

| № лота | Наименование предметов торгов | Начальная цена продажи имущества, с учетом НДС (20%), бел. руб. | Сумма задатка, с учетом НДС (20%), бел. руб. |
|---|---|---|---|
| **Информация о земельном участке:** лот №1-3 расположены на земельном участке с кадастровым номером **341500000011000019** площадью **0,8710 га** – для строительства и обслуживания производственной базы **(право постоянного пользования)**. Местонахождение: **Гомельская обл., Мозырский р-н, г. Мозырь, пер. Концевой, д. 11** | | | |
| 1 | **Изолированное помещение с инв. № 330/D-1522**, площадью **749,0 кв. м,** назначение – участок по производству обуви, наименование – **участок по производству обуви** | **40 848,50** | 2 042,43 |
| 2 | **Изолированное помещение с инв. № 330/D-1521**, площадью **386,0 кв. м,** назначение – цех по производству пластиката, наименование – **цех по производству пластиката** | **28 989,50** | 1 449,48 |
| 3 | **Изолированное помещение с инв. № 330/D-1348**, площадью **801,0 кв. м,** назначение – бытовые помещения, наименование – **бытовые помещения** | **57 914,00** | 2 895,70 |

**Продавец:** Совместное общество с ограниченной ответственностью «Охотник», г. Мозырь, ул. Нефтестроителей, 10. Конт. тел.: 8 (029) 730-57-88 – Жданович Людмила Валентиновна. **Шаг аукционных торгов – 5% от начальной цены предмета торгов и не изменяется в течение всего аукциона. Для участия в аукционе необходимо: 1)** Оплатить задаток на расчетный счет **Продавца (СООО «Охотник»):** р/с BY78BAPB30124407800130000000, БИК BAPBBY23912 (рубли РБ) в РКЦ №38 филиала ОАО «Белагропромбанк» ГОУ, УНП банка 400060581, УНН 400368961,ОКПО 28850579, назначение платежа – задаток за участие в аукционных торгах (задаток для участия в аукционе перечисляется до подачи заявления);

| Номера лотов | Наименование техники | Местонахождение объекта | Начальная цена продажи (бел. руб.) | Сумма задатка (бел. руб.) |
|---|---|---|---|---|
| 137 | ПСГ-160(431410) скл. перекачивающая станц. горючего с/о 163 на ЗиЛ–431410, ш. 3147922, дв. 832364, 1991 г., *4 кат., 1 284 км* | н. п. Михановичи, в/ч 52188 | 7 000,00 | 700,00 |
| 138 | Гусеничное шасси МТ-Лбу *(демилитаризованное)* из-под Р-381Т3 №046032 в составе: гусеничное шасси МТ-Лбу, ш.108711001, дв. 080910, 1987 г., *4 кат., 996 км.* Электроагрегат ЭД-8-Т/400-1ВСС №542, 1987 г. *4 кат., 99 м/ч* | г. Осиповичи, в/ч 01313 | 50 000,00 | 5 000,00 |
| 139 | Гусеничное шасси МТ-Лбу *(демилитаризованное)* из-под Р-381Т1, №438608 в составе: гусеничное шасси МТ-Лбу, ш. 10Е8805040, дв. 8816501, 1988 г., *4 кат., 739 км.* Электроагрегат ЭД-8-Т/400-1ВСС, №631, 1988 г. *4 кат., 138 м/ч* | г. Осиповичи, в/ч 01313 | 51 000,00 | 5 100,00 |
| 140 | Гусеничное шасси МТ-Лбу *(демилитаризованное)* из-под Р-381Т1, №438607 в составе: гусеничное шасси МТ-Лбу, ш. 10Е8804055, дв. 8806514, 1988 г., *4 кат., 737 км.* Электроагрегат ЭД-8-Т/400-1ВСС, №630, 1988 г. *4кат., 135 м/ч* | г. Осиповичи, в/ч 01313 | 51 000,00 | 5 100,00 |
| 141 | Гусеничное шасси МТ-Лбу *(демилитаризованное)* из-под Р-381Т2, №052015, в составе: гусеничное шасси МТ-ЛБу, ш. 108710062, дв. 080548, 1987 г., *4 кат., 498 км.* Электроагрегат ЭД-8-Т/400-1ВСС, №544, 1987 г., *4 кат., 112 м/ч* | г. Осиповичи, в/ч 01313 | 51 000,00 | 5 100,00 |
| 142 | Гусеничное шасси МТ-Лбу *(демилитаризованное)* из-под Р-381Т2, №046021, в составе: гусеничное шасси МТ-Лбу, ш. 10Е8806035, дв. 8814425, 1988 г., *4 кат., 1314 км.* Электроагрегат ЭД-8-Т/400-1ВСС, №606, 1988 г., *4 кат., 136 м/ч* | г. Осиповичи, в/ч 01313 | 51 000,00 | 5 100,00 |
| 143 | Гусеничное шасси МТ-Лбу *(демилитаризованное)* из-под Р-381Т2, №046028 в составе: гусеничное шасси МТ-ЛБу ш. 10Е8807005, дв. 8828455, 1988 г., *4 кат., 386 км.* гусеничное шасси МТ-Лбу, ш. 10Е8807005, дв. 8828455, 1988 г., *4 кат., 386 км* | г. Осиповичи, в/ч 01313 | 51 000,00 | 5 100,00 |
| 144 | Гусеничное шасси МТ-Лбу *(демилитаризованное)* из-под Р-381Т2, №040031 в составе: гусеничное шасси МТ-ЛБу, ш. 10Е8806063, дв. 984430, 1988 г., *4 кат., 382 км.* Электроагрегат ЭД-8-Т/400-1ВСС, №636, 1988 г., *4 кат., 71 м/ч* | г. Осиповичи, в/ч 01313 | 51 000,00 | 5 100,00 |

Аукцион состоится по адресу: г. Минск, ул. Казинца, д. 2, 6-й этаж, 12 октября 2017 г. в 11.00.

К участию в аукционе допускаются юридические лица, индивидуальные предприниматели и физические лица, оплатившие задаток, гарантийный депозит и подавшие заявление на участие в аукционе, соглашение, учредительские и другие необходимые документы до **16.00 9 октября 2017 года**.

Заключительная регистрация участников аукциона будет производиться **12 октября 2017 г. с 9.00 до 9.45.**

**Победитель аукциона обязан:**

1. Заключить договор купли-продажи не позднее 3 банковских дней с момента проведения аукциона.

2. Произвести оплату стоимости движимого имущества разовым платежом в течение **5** банковских дней для резидентов Республики Беларусь и **10** банковских дней для нерезидентов Республики Беларусь со дня подписания договора купли-продажи.

Задаток, указанный в таблице, а также гарантийный депозит в размере 300,00 белорусских рублей и денежные средства за выигранное имущество перечисляются на расчетный счет РУП «Белспецконтракт»: белорусские рубли – р/с BY31BLBB30120101099370001001 в ОАО "Белинвестбанк", г. Минск, пр-т Машерова, 29, код BLBBBY2X, российские рубли – р/с BY05BPSB30121078830876430000 (RUR), в Центре банковских услуг №701, ОАО"БПС-Сбербанк" г. Минск, ул. Чкалова, 18/1, код BPSBBY2X, УНН 101099370, ОКПО 37401662 Корреспондент-Сбербанк России г. Москва № корсчета 30111810100000000090. Реквизиты банка: БИК 044525225, ИНН 7707083893 к/с в ОПЕРУ Московского ГТУ Банка России №30101810400000000225, УНП 101099370, БИК 153001369. **Без НДС**. **Справки по тел. (017) 398 05 41, факс (017) 398 05 41.**



Центр Промышленной Оценки

- **Организация аукционов**
- **Оценка всех видов имущества**

**Извещение о проведении повторного аукциона**

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703 |
| **Продавец** | Сельскохозяйственное унитарное предприятие «Жлобинская птицефабрика», Гомельская обл., Жлобинский р-н, д. Солоное, ул. Садовая, д. 52а |

**Предмет аукциона – здания и сооружения птицефабрики (имущество реализуется одним лотом).**
**Месторасположение: Гомельская обл., Жлобинский р-н, Солонский с/с, 12**

**Одноэтажное кирпичное здание гаража на десять транспортных единиц** (356,4 кв. м).
**9 одноэтажных панельных зданий птичников с пристроенными вентиляционными камерами** (1612,8 кв. м, 1652,2 кв. м, 1655,7 кв. м, 1651,4 кв. м, 1539 кв. м, 1641,3 кв. м, 1464,2 кв. м, **№17** – 1670,6 кв. м, **№18** – 1669,8 кв. м).
**6 зданий птичников** (**№1** – 1556,6 кв. м, **№2 –**1493 кв. м, **№3 –** 1547 кв. м, **№4 –** 1557,3 кв. м, **№8** – 1590 кв. м, **№9** – 1498 кв. м).
**Одноэтажное панельное здание инкубатора с пристроенным кирпичным складом** (1468,7 кв. м).
**Убойный цех** (составные части: склад тары, быт. помещения, котельная, тамбур, приемно-загрузоч. пункт, навес для тары, цех утилизации) (2823 кв. м).
**Здание лаборатории ветеринарной службы** (составные части и принадлежности: тамбур) (334,3 кв. м).
**Одноэтажное кирпичное, с пристроенными кирпичными гаражом на две транспортные единицы и проходной, здание ветсанпропускника** (363,4 кв. м).
**Здание санитарной бойни** (составные части: тамбур) (82 кв. м).
**Здание весовой** (составные части и принадлежности: автомобильные весы, крыльцо) (108,4 кв. м).
**Здание механической мастерской** (составные части: смотровая яма, две пристройки) (466 кв. м).
**Одноэтажное кирпично-бетонное, с кирпичной пристройкой, здание склада концентрированных кормов силосного типа на 960 т кормов с пристроенным навесом (**242 кв. м).
**Одноэтажное напольного типа панельное здание сенажной башни** (63,6 кв. м).
**Одноэтажное кирпичное здание зерносклада с пристроенными двумя сараями и зерносушилкой, с отдельно расположенным навесом** (217,4 кв. м).
**Одноэтажное кирпичное здание склада подстилки** (1471 кв. м).
**Одноэтажное, напольного типа, панельное здание сенажной башни** (63,6 кв. м).
**Одноэтажное кирпичное, с кирпичной пристройкой, здание навеса для тракторов на четыре транспортные единицы** (928,3 кв. м).
**Одноэтажное панельное, облицованное кирпичом, здание автомастерской с отдельно расположенной мойкой машин** (313,1 кв. м).
**Двухэтажное кирпичное административное здание с ограждением и благоустройством** (1166,2 кв. м).
**Малогабаритная автозаправочная станция, состоящая из одноэтажного кирпичного здания диспетчерской и четырех подземных емкостей для хранения ГСМ общим объемом 100 куб. м** (41,1 кв. м).
**3 одноэтажных кирпичных зданий ТП** (№ 494 – 46,8 кв. м, (№ 524 – 46,1 кв. м, (№ 648 – 51,2 кв. м), в том числе **электрооборудование ТП.**
**Одноэтажное кирпичное с бетонной подземной частью здание канализационной насосной станции по перекачке 160 куб. м стоков в час (**105,6 кв. м).
**Подземная водопроводная сеть хозпитьевой воды** (2812 м).
**Подземная хозфекальная канализационная сеть** (3246 м, 2851 м, 395 м).

**Сведения о земельном участке**: пл. **30,3415 га** предоставлен продавцу для обслуживания производственных зданий (земельный участок для размещения объектов иного назначения) на праве постоянного пользования. Ограничения (обременения) – находится в придорожных полосах (контролируемых зонах) автомобильных дорог, пл. 2,0929 га

**Начальная цена с НДС – 1 246 480,02 бел. руб. (снижена на 80%)**

**Задаток 1%** от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях перечисляется на р/с № BY60BLBB30120191021390001001; в Дирекции «ОАО Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

**Срок подписания договора купли-продажи: 15 (пятнадцать)** рабочих дней после снятия продавцом в установленном законодательством порядке всех зарегистрированных ограничений (обременений) и согласования проекта договора купли-продажи с ОАО «Белагропромбанк» в связи с наличием обременения в пользу банка (ипотека)

Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.cpo.by

Предыдущее извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» от **05.08.2017**

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия

**Аукцион состоится 18.09.2017 в 11.00** по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703. Заявления на участие и необходимые **документы принимаются по 14.09.2017 до 17.00** по указанному адресу.
**Тел.: +375 17 280-36-37; 8029 317-95-42. www.cpo.by.**
**Email: auction@cpo.by**

■ Хочаце — верце

# АПОШНЯЯ ТАЯМНІЦА ПІРАМІДЫ ХЕОПСА?

**Навуковец лічыць, што ў ёй схаваная дата прылёту планеты-забойцы Нібіру**





**Год таму астролагі ўжо паведамлялі пра ўнікальны феномен, які ўдасца назіраць толькі ў гэты дзень.**

Егіптолаг Дэвід Мід падчас даследаванняў піраміды Хеопса прыйшоў да высновы, што менавіта там схаваная дата прылёту таямнічай планеты Нібіру, з якой многія ўфолагі і прадказальнікі звязваюць апакаліптычныя прароцтвы. Як паведаміў журналістам Мід, пасля дбайных даследаванняў старажытных пірамід Хеопса яму ўдалося разгадаць складаны шыфр з лічбамі, які хаваўся ўнутры грабніцы. Згодна з адкрыццём гэта здарыцца 23 верасня 2017 года і апісваецца як пачатак Апакаліпсісу. Паводле яго слоў, менавіта ў гэты дзень да Зямлі наблізіцца планета Нібіру. Егіптолаг падкрэсліў, што старажытныя жыхары Егіпта многае ведалі і з дапамогай пасланняў унутры пірамід наперад папярэдзілі нашчадкаў аб будучых катастрофах.

Гэта з'ява апісана ў Адкравенні і раскрывае паняцце Апакаліпсіса. «Жанчына, ахінутая Сонцам», — сузор'е Дзевы, «12 зорак вянком на галаве» — гэта найярчэйшыя нябесныя целы, а «ў пакутах яна народзіць» Юпітэр (верш з Адкравення). Згодна з астранамічнымі прагнозамі, 23 верасня сапраўды ў сузор'і Дзевы можна будзе ўбачыць 12 самых яркіх зорак. Але не гэта галоўнае, сцвярджае Мід: у гэты дзень сузор'е Дзевы і яго самая яркая зорка Рэгул «будуць свяціць у напрамку піраміды Хеопса». Егіптолаг цвёрда стаіць на сваім, малюючы схемы і робячы разлікі: толькі 23 верасня з адной з галерэй піраміды Хеопса можна будзе ўбачыць зорку Рэгул, якая нібыта і стане прадвесніцай катастрофы.

Як раней паведамлялі СМІ, нядаўна ў NASA афіцыйна пацвердзілі існаванне міфічнай планеты Нібіру. Аднак, як заявілі ў аэракасмічным агенцтве, нябеснае цела не ўяўляе для чалавецтва ніякай небяспекі

■ На заметку

# САПСАВАНЫЯ ПРАДУКТЫ ВЫДАДУЦЬ «РАЗУМНЫЯ» НАЛЕПКІ

**Як радавыя спажыўцы, мы прывыклі давяраць (ці не давяраць) маркіроўцы на прадуктах харчавання з пазначэннем тэрміну прыдатнасці. Але, як даўно вядома, нядобрасумленныя прадаўцы знаходзяць спосабы абыходу гэтай сістэмы, каб не губляць выгаду і прадаць пакупніку і пратэрмінаваны тавар. Магчыма, пазбегнуць гэтай праблемы ў будучыні дапамога вынаходка амерыканскіх хімікаў з Універсітэта Кларксана. Яны распрацавалі новы від простых тэстаў, здольных распазнаваць сапсаваныя або заражаныя бактэрыямі прадукты харчавання і касметыку.**

Аб выніках сваёй працы навукоўцы расказалі на 254-м Нацыянальным з'ездзе і выстаўцы Амерыканскага хімічнага таварыства ў Вашынгтоне, а часопіс Science апублікаваў падрабязнасці распрацоўкі. Асноўнай мэтай навукоўцаў было стварэнне простага спосабу тэсціравання прадуктаў, каб распазнаць прыкметы таго, што яны не прыдатныя ў ежу. Эксперты абапіраліся на ўжо вядомыя лабараторныя спосабы. Як адзначае аўтар даследавання Сільвана Андрээску, «большасць навукоўцаў, што працуюць над падобнымі сенсарамі, выкарыстоўваюць растворы, якія рухаюцца па каналах. Мы ж карыстаемся ўстойлівымі неарганічнымі часціцамі, якія праяўляюць акісляльна-аднаўленчую актыўнасць. Калі яны ўзаемадзейнічаюць з рэчывамі, якія мы хочам заўважыць, то мяняюць колер, і ад канцэнтрацыі рэчыва залежыць, наколькі значная гэтая змена».



Гатовыя «разумныя» стыкеры ўяўляюць сабой шматкі паперы памерам з паштовую марку. На гэтыя невялікія тэст-сістэмы нанесеныя адмысловыя рэчывы-індыкатары, якія паказваюць на прысутнасць у аналізаваным аб'екце таго ці іншага рэчыва. У выпадку кантакту са злучэннямі, якія сігналізуюць аб тым, што прадукт непрыдатны для ўжывання, індыкатары мяняюць колер. Ужо цяпер новыя тэст-сістэмы могуць выяўляць архатаксін А — вельмі таксічнае рэчыва, якое выпрацоўваецца плеснявымі грыбамі падчас паражэння цвіллю мноства прадуктаў харчавання.

Але і гэта яшчэ не ўсё. Як запэўніваюць вучоныя, іх распрацоўку можна выкарыстоўваць яшчэ і для вызначэння месца вытворчасці гарбаты або віна па ўнікальным складзе антыаксідантаў. А ў будучыні эксперты плануюць пашырыць функцыянальнасць сваіх тэстаў: яны хочуць дадаць магчымасць выяўлення сальманелы, кішачнай палачкі і шэрагу іншых небяспечных для здароўя ўзбуджальнікаў інфекцыйных захворванняў.

■ Чалавек

## ЗДАРОВЫЯ СЭРЦЫ

**Вывучаючы прадстаўнікоў аднаго з карэнных народаў Балівіі, навукоўцы выявілі ў іх незвычайна моцнае здароўе. Прычына можа быць звязаная з іх харчаваннем.**



На поўначы Балівіі, у дэпартаменце Бені, жыве індзейскае племя цымане (Tsimane). На працягу стагоддзяў яго прадстаўнікі селяцца ўздоўж рэк у трапічных лясах, займаючыся паляваннем, рыбалоўствам і сельскай гаспадаркай. Нават у XXI стагоддзі стыль іх жыцця не зведаў істотных змен. Вывучэннем здароўя людзей з гэтага племені медыкі займаюцца даўно. Падагульнўшы сабраныя за шмат гадоў даныя, навукоўцы прадставілі дзіўныя высновы: прадстаўнікі цымане амаль не знаёмыя з сардэчна-сасудзістымі захворваннямі.

У рамках навуковай работы спецыялісты наведалі 85 вёсак цымане, абследаваўшы 705 чалавек ва ўзросце 40—94 гадоў. Нізкая або ўмеранная рызыка сардэчных захворванняў была дыягнаставаная ў 16% індзейцаў. Аналагічнае даследаванне здароўя амерыканцаў дае 50-працэнтную рызыку. Медыкі ўстанавілі, што артэрыі ў 80-гадовага прадстаўніка карэннай балівійскай народнасці больш здаровыя, чым у амерыканца ва ўзросце 55 гадоў.

Навукоўцы звязваюць гэтую розніцу з харчаваннем цымане. Іх рацыён складаецца на 72% з вугляводаў, на 14% з тлушчаў і на 14% з бялкоў. Для сярэднестатыстычнага амерыканца гэтыя паказчыкі на ўзроўні 52%, 34% і 14% адпаведна. Пры гэтым крыніцай бялку для цымане з'яўляецца нятлустае мяса, тады як у амерыканцаў гэта менш карысныя прадукты. Акрамя таго, цымане шмат рухаюцца — палююць, рыбачаць, збіраюць садавіну і арэхі, разводзяць жывёлу. У сярэднім іх штодзённая фізічная актыўнасць складае 4—7 гадзін.

## ЛІШНЯЯ ВАГА

**Амерыканскія навукоўцы ацанілі колькасць людзей з лішняй вагой ва ўсім свеце, такіх аказалася каля 2,2 мільярда чалавек. Адпаведнае даследаванне апублікавана ў New England Journal of Medicine, коратка пра яго паведамляе выданне Ars Technica.**

Каля 712 мільёнаў чалавек (10% людзей ва ўсім свеце) пакутуюць на атлусценне, сярод іх 108 мільёнаў дзяцей і 604 мільёны дарослых. Часцей за ўсё атлусценне сярод дарослых назіраецца ў Егіпце, сярод дзяцей — у ЗША, радзей за ўсё сярод дарослых — у В'етнаме, сярод дзяцей — у Бангладэш. Па абсалютнай колькасці тых, хто пакутуе на атлусценне, лідзіруюць ЗША і Кітай — па дарослых, Кітай і Індыя — па дзецях.



Да падобных высноў аўтары прыйшлі, правёўшы метааналіз даных пра людзей, якія пакутуюць на лішнюю вагу, сабраных у перыяд з 1980 па 2015 год. Даследаванне падтрымлівалася Фондам Біла і Мелінды Гейтс. Індэкс масы цела ад 25 да 29 кажа пра залішнюю вагу, атлусценне дыягнастуецца, калі гэты параметр дасягае 30 і перавышае яго. Гэтыя крытэрыі не датычацца спартсменаў-цяжкавагавікоў.

■ Дзе нас няма

# АЎТАМАБІЛЬ — НЕ РАСКОША?

**Rolls-Royce Sweptail — самы дарагі аўтамабіль у свеце коштам у 13 млн долараў**



**Брытанская кампанія Rolls-Royce выпусціла ў адзіным экзэмпляры ўнікальнае купэ Sweptail, кошт якога склаў рэкордныя 13 мільёнаў долараў.**

На заказ кліента, чыё імя трымаецца ў сакрэце, Rolls-Royce вырабіў экстравагантнае купэ Sweptail. Брытанцы кажуць, што ў 2013 годзе да іх звярнуўся вялікі знаток эксклюзіўных аўтамабіляў, яхтаў і самалётаў, заявіўшы аб намеры набыць Rolls-Royce. Прычым, вядома ж, не які-небудзь там звычайны, які можна проста сустрэць на вуліцы, а зроблены спецыяльна для яго, адзін-адзіны.





Да таго ж аўтамабіль абавязкова павінен быць натхнёны класічнымі мадэлямі маркі 1920-х і 1930-х гадоў. Зразумела, у таямнічага кліента было вельмі-вельмі шмат грошай, якія ён не супраць быў выдаткаваць на новую цацку, так што англічане з задавальненнем узяліся за работу. За аснову быў узяты шыкоўны Rolls-Royce Phantom Coupe с 6,75-літровым маторам V12.

Пасля трох гадоў напружанай працы Rolls-Royce нарэшце прадэманстраваў вынік. Брытанцы пахваліліся, што на дызайн гэтага эпічнага купэ з падоўжанай задняй часткай аказалі ўплыў мадэлі Phantom I Round Door 1925 года, Phantom II Streamline Saloon 1934 года, Gurney Nutting Phantom II Two Door Light Saloon 1934 года і Park Ward 20/25 Limousine Coupe 1934 года.

Унутры засталося толькі два крэслы, а ў цэнтральнай кансолі з'явіўся халадзільнік для шампанскага і двух куфляў. Кошт эксклюзіўнага аўтамабіля склаў больш за 10 мільёнаў фунтаў стэрлінгаў, ці крыху менш за 13 мільёнаў долараў па цяперашнім курсе. І гэта абсалютны рэкорд сярод любых новых аўтамабіляў, таму што нават гіперкар Bugatti Chiron каштуе ў чатыры разы танней! Шкада, што мы наўрад ці калі-небудзь убачым Sweptail на нашых вуліцах ■




**Навукоўцы часта задумваюцца аб тым, ці ўдасца людзям перажыць якую-небудзь страшную катастрофу. Напрыклад, што з намі стане, калі з космасу на Зямлю грукнецца гіганцкі астэроід? Або згасне Сонца? Шанцаў у людзей не вельмі шмат, затое ў ціхаходак, мікраскапічных бесхрыбетных, блізкіх да членістаногіх, іх дастаткова — да такіх высноў прыйшлі даследчыкі Оксфардскага ўніверсітэта пасля шэрагу доследаў.**

Ціхаходкі вельмі непераборлівыя і могуць выжываць нават у даволі жорсткіх умовах. Напрыклад, іх неяк замаразілі на 30 гадоў, а потым размаразілі і выявілі, што яны жывыя-здаровыя, хочуць і, галоўнае, могуць размнажацца. Выдатна адчувалі яны сябе і ў іншых складаных умовах, напрыклад пры ўздзеянні высокай тэмпературы і на дне акіяна.

Каб высветліць, на што яшчэ здольныя гэтыя дзіўныя істоты, навукоўцы з Оксфардскага ўніверсітэта ўзнавілі ў лабараторыях умовы, блізкія да тых, што могуць узнікнуць на нашай планеце пасля якой-небудзь катастрофы. Даследчыкі абралі магчымыя сцэнарыі, сярод якіх была ўспышка звышновай, гіганцкі астэроід і гама-ўсплёскі. Пасля серыі доследаў яны прыйшлі да высновы, што ў ціхаходак, здаецца, ёсць усе шанцы перажыць чалавецтва.

Дастатковага па габарытах для знішчэння ціхаходак астэроіда ў найбліжэйшы час чакаць не даводзіцца, а гама-ўсплёск, які здольны забіць гэтых бесхрыбетных, таксама павінен адбыцца дастаткова блізка ад Зямлі, што пакуль зусім не плануецца. Выбух звышновай таксама павінен быць дастаткова моцным і адбыцца побач з Зямлёй, а пакуль наяўныя варыянты не змогуць прычыніць ціхаходкам шкоды, бо яны спакойна пераносяць даволі моцную радыяцыю і могуць цалкам камфортна існаваць на дне акіянаў у падводных вулканах, напрыклад. Ціхаходкі змаглі ўстойліва перанесці ўсе мяркуемыя навукоўцамі выпрабаванні, што ў сваю чаргу дало даследчыкам новую пажыву для разважанняў. «Здаецца, калі жыццё ўжо зарадзілася дзе-небудзь, знішчыць яго становіцца даволі складана», — кажа доктар Дэвід Слован, адзін з аўтараў даследавання.

Матэрыялы падрыхтаваў Іван КУПАРВАС. hvir@zviazda.by



■ Нефармат

# ТАКІЯ РОЗНЫЯ ДАРОГІ

Апошнім часам у камандзіроўкі ездзіць даводзіцца часта. Розныя трапляюцца дарогі, такія розныя, што вам не расказаць. Ну вось, напрыклад, у Маларыцкі райвыканкам я з'явілася зусім... мокрая. У канцы чэрвеня ў Брэсце ліваў лівень быў, па тэлевізары ўвечары паказвалі, як абласны цэнтр «плаваў». Дык вось, ранкам, як толькі горад накрыла дажджом (такое давялося бачыць упершыню), пяць хвілін да прыпынку хапіла, каб прамокнуць да ніткі. Але ж не павернеш назад, людзі чакаюць, дамоўленасць, нават не з адным чалавекам на пэўны час, абавязвае.

І колькі той язды ў Маларыту — адна гадзіна. А там аказалася суха, ні кропелькі не ўпала. Таму нават міліцыянер на ўваходзе паглядзеў на мой мокры прыкід вельмі ўважліва, мауляў, у якім возеры гэтая дама зранку купалася ва ўсёй адзежы? Але нічога не сказаў. А ў райсавеце адразу распачувалі, далі стос паперы, каб пакласці ў туфлі і хоць крышку іх прасушыць. Нават дадому ўвечары давялося тады вяртацца ў злёгку вільготным адзенні. Добра, што днём было даволі цёпла. Ды гэта ўжо згадваецца весела, амаль як прыгода. А вось шлях са Століна ўспамінаецца горш: пяць гадзін у перапоўненай маршрутцы, дзе над табой літаральна вісіць не зусім цвярозы спадарожнік. І такое, на жаль, бывае.

Дык вось, нядаўняя паездка амаль што ў прыгарадны сельсавет на дызель-цягніку паўночнага напрамку выдалася нібы сеанс у старым добрым кіно. Калі перад адпраўленнем паглядзела ў інтэрнэце час знаходжання ў дарозе, была, мякка кажучы, здзіўлена. Поезд пераадольвае гэтыя 25 кіламетраў за гадзіну. Для параўнання электрычкі мінскага напрамку за гэты час даходзяць да Аранчыц, пераадольваючы амаль 100 кіламетраў. Па дарозе ўсё стала ясна. Дызель робіць прыпынкі ледзь не праз тры кіламетры, бо па ўсім маршруце мноства дачных пасёлкаў. І абсалютная большасць яго пасажыраў тыповыя дачнікі — людзі пенсійнага ўзросту з характэрнай паклажай — вёдрамі, кашамі, куды складзены пакеты з прадуктамі. У зваротным напрамку, зразумела, вёдры і кошыкі будуць ехаць напоўненыя ўраджаем з садоў і агародаў.

Гадзіна тая праляцела непрыкметна. Бо людзі вакол гаварылі паміж сабой, усміхаліся, атмасфера была напоўненая нейкай асаблівай добразычлівасцю. У горадзе даўно такога не ўбачыш. У транспарце большасць едзе, утаропіўшыся ў экраны смартфонаў, з навушнікамі. Яны не чуюць і не бачаць нікога акрамя сябе. Таму было цікава назіраць за людзьмі, што камунікуюць ужывую. Тым больш што недалёка ад мяне размясцілася кампанія дачнікаў, якія аказаліся знаёмымі, — усю дарогу абмяркоўвалі вырашчаны ўраджай, апошнія навіны, гаварылі пра жыццё. Некаторыя іх разважанні падаліся асабліва цікавымі і надзённымі.

За горадам проста мусіла ўзнікнуць грыбная тэма. Яе распачаў маладжавы пенсіянер, які ехаў з мілавіднай і дагледжанай жонкай. Сказаў, што летам амаль неназбіраў грыбоў, наогул гэты год, хутчэй за ўсё, не грыбны і апошняе яго, як бывалага грыбніка, засмучае. А старэйшая кабета насупраць заўважыла, што грыбы — не самая лепшая ежа, асабліва ў сталым узросце: «Чулі, як па тэлевізары нядаўна наш знакаміты трансплантолаг Алег Румо гаварыў, што ён перастаў ужываць грыбы пасля таго, як перасадзіў печань першаму пацыенту, які атруціўся бледнай паганкай. Аднаму перасадзілі, а колькі такіх пamірае практычна кожны год! Дык ці вартае яно таго?» — працягвала кабета. Яе суразмоўнік з выразным голасам — мабыць, усё ж вайсковец у мінулым — не згаджаўся: «А не трэба збіраць немаведама што. Я бяру толькі тыя грыбы, якія добра ведаю, і не разумею, як можна атруціцца нейкай паганкай». Тады размову падхапіла яшчэ адна жанчына, згадала сваіх аднавяскоўцаў. У адной хаце там пражывалі муж з жонкай і яе брат. Усё жыццё мужчыны былі заядлымі грыбнікамі. Аднойчы назбіралі першых вясновых грыбоў, наварылі, наеліся. Толькі гаспадыню ўдалося выратаваць, бо яна амаль не ела грыбную страву. Былая вясковая жыхарка заўважыла, што абазнаныя і дасведчаныя таксама могуць памыліцца, бо з гадамі, напрыклад, падводзіць зрок.

Мне тады прыгадалася сустрэча прыблізна пяцігадовай даўніны на адным семінары. Суседкай па гасцінічным нумары аказалася маладая калега. За вячэрай яна сказала, што не ўжывае грыбы. Я нават спрабавала пажартаваць, а яна сур'ёзна адказала, што была яшчэ падлеткам, як памёр бацька. Працаваў лесніком, грыбы ведаў як ніхто. Маці тады гасціла з дзецьмі ў сваёй маці... Ёй далі заключэнне аб прычыне смерці менавіта ад грыбоў. Яна ўсё жыццё не магла знайсці іншага тлумачэння, як толькі пагаршэнне зроку, якое стала заўважаць у мужа.

А мае спадарожнікі тым часам разважалі пра бяду, якая можа спасцігнуць кожнага, а потым перайшлі на тэму суседзяў, такую важную для любога дачніка. Гаваркі «вайсковец» расказаў пра чалавека, які набыў дачу побач з яго некалькі гадоў таму. І перахаў з іншага дачнага пасёлка, бо надта праблемныя суседзі там былі. Паводле слоў расказчыка, яны з Сямёнавічам вельмі пасябравалі. Дапамагаюць адзін аднаму на ўчастках, і жонкі могуць сумесны абед прыгатаваць, і за келіхам віна пасядзяць усе разам. Такія суседзі — удача.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.** *yackevich@zviazda.by*

# СЁННЯ

## Сонца

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 6.03 | 19.54 | 13.51 |
| Віцебск — | 6.03 | 19.54 | 13.51 |
| Магілёў — | 6.06 | 19.53 | 13.47 |
| Гомель — | 6.06 | 19.46 | 13.40 |
| Гродна — | 6.32 | 20.17 | 13.45 |
| Брэст — | 6.35 | 20.15 | 13.40 |

## Месяц

*Першая квадра 29 жніўня. Месяц у сузор'і Казярога.*

## Імяніны

*Пр. Георгія, Дзяніса, Емяльяна, Івана, Іларыёна, Міхаіла, Рыгора, Яўгена.*
*К. Ізабелы, Паўліны, Багдана, Марка, Раймунда.*



Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

# ЗАЎТРА




## ...у суседзяў

ВАРШАВА +25..+27°C
ВІЛЬНЮС +22..+24°C
КІЕЎ +18..+20°C
МАСКВА +19..+21°C
РЫГА +21..+23°C
С.-ПЕЦЯРБУРГ +19..+21°C

■ А не шкодзь!

## Лавілася рыбка...

**Непрацуючыя жыхары пасёлка Кастрычніцкі на вадаёме былых торфараспрацовак «Разлівы» сеткамі лавілі рыбу.**

Іх затрымалі супрацоўнікі Баранавіцкай міжраённай інспекцыі, калі мужчыны везлі на веласіпедзе тры мяхі з рыбай. У іх знаходзілася 37,5 кілаграма незаконнай здабычы, а дакладней — 115 карасёў, дзве ліні і адзін шчупак. Урон навакольнаму асяроддзю ацэнены ў памеры 2 990 рублёў, кошт рыбы склаў 232 рублі. А меру адказнасці грамадзян за ўчыненае браканьерства вызначыць суд.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.** *yackevich@zviazda.by*

## Дробязь на буйную суму

**У Гродзенскім раёне на возеры Кань-Белае дзяржінспектары затрымалі жыхара аграгарадка Азёры, які лавіў рыбу сеткамі.**

Для свайго незаконнага промыслу мужчына выбраў дзве дробнаячэістыя сеткі з памерам ячэі два сантыметры і агульнай даўжынёй 140 метраў. Не дзіўна, што ў іх патрапілі 312 асобін рыбінай дробязі, у асноўным плоткі. Магчыма, парушальнік якраз і разлічваў на такі ўлоў, бо невялікую рыбу лёгкая высушыць і прадаць. Аднак ніякая выручка не ідзе ў параўнанне з сумай нанесенай прыродзе шкоды: улоў абыдзецца парушальніку ў 7,2 тысячы рублёў, заведзена крымінальная справа. Дарэчы, яе фігурант ужо неаднаразова прыцягваўся за лоўлю рыбы сеткамі, апошні раз — гэтай зімой.

**Сяргей РАСОЛЬКА.** *rs@zviazda.by*

Даты | Падзеі | Людзі

### 31 ЖНІЎНЯ

**1749** год — нарадзіўся Аляксандр Мікалаевіч Радзішчаў, рускі мысліцель, пісьменнік. Заснавальнік рускай рэвалюцыйнай педагогікі, этыкі і эстэтыкі, рэалістычнага метаду ў рускай прозе. Аўтар філасофска-публіцыстычнага трактата «Падарожжа з Пецярбурга ў Маскву», оды «Вольнасць» і іншых твораў. У 1790 годзе быў заключаны ў Петрапаўлаўскую крэпасць, асуджаны да смяротнага пакарання, якое было замена ссылкай на 10 гадоў у Сібір. У ссылцы напісаў філасофскі трактат «Пра чалавека, пра яго смяротнасць і бессмяротнасць».

**1789** год — нарадзіўся (Гродзеншчына) Вінцэнт Карчэўскі, беларускі астраном, матэматык. Прадстаўнік Віленскай астранамічнай школы. У 1807—1811 гадах вучыўся ў Віленскім універсітэце, затым працаваў у ім і адначасова — у Віленскай астранамічнай абсерваторыі. Навуковыя працы — па астраноміі (даследаванне яркасці зорак, назіранне планет, камет, астэроідаў). Аўтар падручнікаў па астраноміі і матэматыцы. Прытрымліваўся матэрыялістычных поглядаў, прыхільнік вучэння М. Капярніка і асветніцкіх ідэй. Памёр у 1832 годзе.

**1827** год — расійскі імператар Мікалай I выдаў рэскрыпт аб тым, што прыгонныя сяляне і дваровыя людзі не павінны навучацца ва ўстановах, вышэйшых за парафіяльныя і павятовыя вучылішчы.

**1935** год — забойшчык шахты «Цэнтральная-Ірміна» (Данбас) Аляксей Стаханаў устанавіў сусветны рэкорд здабычы вугалю адбойным малатком, выдаўшы за змену 102 тоны вугалю. Рэкорд даў магутны імпульс так званаму стаханаўскаму руху — масаваму руху працоўных СССР за высокапрадукцыйную працу.

**1947** год — узняўся ў паветра першы доследны ўзор самалёта АН-2 (знакаміты «кукурузнік»).



Было сказана

**Якуб КОЛАС, народны паэт Беларусі:**
*«Які прывет — такі прыём, Які тавар — такая плата».*

## УСМІХНЕМСЯ

**Жонка прыгатавала вячэру: курынае філе з шампіньёнамі, цыбуляй, таматамі, тушанае ў чырвоным віне з баклажанавай пастай. Муж пасля працы пачынае моўчкі паглынаць ежу.**
**Жонка, з дакорам:**
**— Дарагі, можа вячэру пахвалі ці што!**
**Муж, уважліва гледзячы ў талерку, вельмі сур'ёзна і нават неяк пяшчотна:**
**— Вячэра, ты смачная!**

Як кажуць алкаголікі, жыццё цудоўнае, пакуль ёсць печань.

**Сусед стукаецца ў дзверы:**
**— Здароў, мы купілі новую машыну. Не пазычыш трохі хлеба?**

Калі акадэмік Паўлаў уключаў святло — у сабакі цякла сліна, а калі выключаў — у жонкі балела галава.

**Яна:**
**— А кім вы працуеце?**
**Ён:**
**— Слесарам.**
**Яна:**
**— Вой, гэта павінна быць вельмі цікава! Усе гэтыя вашы рашпілі, керны, шчыхілі, фланцавыя прыціркі, разьба пад муфту, стапарэнне калібровачным шпунтам! Ведаеце, я ў гэтым нічога не разумею...**


caricatura.ru

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА
ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь
РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.
Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.
РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. ДРЫНДРОЖЫК, Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), В. МЯДЗВЕДЗЕВА (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК.
Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».
НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.
ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмная – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, маркетынгу — 337 44 04, бухгалтэрыі: 287 18 81.
Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.
http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zviazda.by,
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by
ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by
Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.
Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004.
220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.
Тыраж 20.008. Індэкс 63850. Зак. № 3232.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
Нумар падпісаны ў 19.30 30 жніўня 2017 года.